РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЛЮТАГА 2025 г. СУБОТА № 22 (30410)

# «СЁННЯ НАВУКА АЗНАЧАЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ»

## Чаго краіна чакае ад навукоўцаў



Дыплом доктара навук з рук Прэзідэнта атрымлівае рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Ірына КІТУРКА.

Тыдзень таму, уручаючы Знак якасці найлепшым беларускім прадпрыемствам, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка казаў, што самымі важнымі апорамі суверэннай дзяржавы з'яўляюцца ў тым ліку традыцыі гэтай дзяржавы. Тыя, якія сфарміравала само жыццё і якія ўкараніліся ў грамадскай свядомасці. Адна з такіх традыцый — уручэнне кіраўніком дзяржавы дыпломаў доктара навук і атэстатаў прафесара навуковым і навукова-педагагічным работнікам. Урачыстая цырымонія прайшла ў пятніцу ў Палацы Незалежнасці.




Фота БелТА.

СТАР. 2–3



ДАПАМОГІ, ПЕНСІІ, ПАДАТКІ... ШТО МЯНЯЕЦЦА З 1 ЛЮТАГА

6–7



НЯМА СІЛ... АДКУЛЬ БЯРЭЦЦА ХРАНІЧНАЯ СТОМЛЕНАСЦЬ, І ЯК ЯЕ ПЕРАМАГЧЫ

12

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25022>

ТЭНДЭНЦЫІ

# СВАЁ — НАЙЛЕПШАЕ





## Як змяняюцца спажывецкія перавагі беларусаў?

Санкцыйны ціск недружалюбных краін закрануў сферу спажывання беларусаў: нейкія брэнды афіцыйна спынілі продажы на тэрыторыі нашай краіны, нейкія падаражэлі ў сувязі з лагістыкай, якая змянілася. Але гэтая акалічнасць мела і іншы вынік — стымуляванне беларускіх вытворцаў не толькі ў частцы пашырэння лінейкі сваіх тавараў, але і ў рамках пошуку новых маркетынгавых стратэгій для прыцягнення пакупнікоў, адзначылі ў Беларускім інстытуце стратэгічных даследаванняў (БІСД).

СТАР. 6–7

# «СЁННЯ НАВУКА АЗНАЧАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Беларусь за гады сваёй незалежнасці пабудавала сур'ёзную навуковую і вытворчую базу, якая дае магчымасць нам паспяхова развіваць эканоміку, павышаць узровень і якасць жыцця людзей, умацоўваць абараназдольнасць краіны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Дзякуючы намаганням многіх пакаленняў беларускіх вучоных і спецыялістаў сёння айчынная навука ўпэўнена развіваецца па розных кірунках. Кожны з вас — прыклад для калег, якія, ідучы за вамі, вучацца гэтаксама верыць у сябе, ставіць перад сабой вялікія мэты, цвёрда і ўпарта ісці да гэтых мэт».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў краіне працягнуць развіваць нацыянальныя навуковыя школы ў тым ліку для таго, каб даць новым пакаленням маладых вучоных шырокае поле магчымасцяў для самарэалізацыі.

**«Мы жывём у эпоху небывалага навуковага прагрэсу. Але час не выбіраюць. Выбірае сам час. Гэта ён сёння ставіць нам задачы — адну складанейшую за другую. Задачы, якія без навукі, без вас, шаноўныя навукоўцы, вырашыць немагчыма. Далей рухацца без рэальнай навукі немагчыма. Адсюль і стаўленне дзяржавы да навукі», — адзначыў беларускі лідар.**

Па яго словах, у найбліжэйшыя гады трэба будзе істотна паскорыць інтэлектуальную мадэрнізацыю нашай эканомікі. «Толькі пры такой стратэгіі магчымы прарыў, які забяспечвае новую якасць жыцця. Я бы нават сказаў выжывальнасць любога грамадства, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Каб вы разумелі вастрыню моманту. Сёння навука азначае незалежнасць дзяржавы. Тэхналогіі захапілі свет, а краіны, якія валодаюць імі, не проста багацеюць, а ўжо дыктуюць правілы жыцця, актыўна прасоўваюць новае светаўладкаванне. І суровая праўда жыцця ў тым, што мы вымушаны змагацца за сваё месца ў новым высокатэхналагічным свеце».

Аляксандр Лукашэнка анансаваў у найбліжэйшы час сустрэчу ў Нацыянальнай акадэміі навук з навуковай грамадскасцю, дзе будуць прадметна абмеркаваны пытанні, якія сёння стаяць перад дзяржаўнай навукай.

**«Але хачу яшчэ раз дакладна пазначыць маю пазіцыю. Наш прыярытэт — прыкладныя навуковыя даследаванні ў тых сферах, дзе ў нас ёсць сур'ёзныя кампетэнцыі і якія запатрабаваны эканомікай і самім жыццём. Пад гэтыя задачы мы заўсёды знойдзем сродкі і створым усе неабходныя ўмовы для вучоных», — заявіў Прэзідэнт.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэтая цырымонія — прызнанне заслуг кожнага з прысутных, а таксама важных для краіны поспехаў і дасягненняў. Яны дэманструюць патэнцыял і магчымасці нашага народа, сілу яго інтэлекту.

«Ад душы дзякую за вялікую творчую працу, мэтанакіраванасць і адданасць любімай справе, якой вы прысвячаеце сваё жыццё. Перакананы, што вы яшчэ шмат чаго зробіце на карысць Беларусі. Я хацеў бы, каб вы зрабілі для нас многае. Жадаю моцнага здароўя, дабрабыту, мірнага неба, новых адкрыццяў і значных здзяйсненняў», — сказаў беларускі лідар.

## ГЭТА САМАЯ СКЛАДАНАЯ ПРАЦА

Прэзідэнт уручыў дыпломы дактароў навук і атэстаты прафесараў. «Я ведаю, што такое праца вучоных, часта пра гэта кажу. Самая цяжкая праца, складанейшая за яе няма. Вы людзі асаблівыя. І стаўленне ў грамадстве да вас асаблівае», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта цырымонія запомніцца яе ўдзельнікам на ўсё жыццё. І па традыцыі такіх сустрэч навукоўцы пагаварылі з кіраўніком дзяржавы. Не для справаздач, а для таго, каб звярнуць увагу на тое, што сёння актуальна не толькі для навукі, але і для краіны.

## ЯКІЯ ВЫКЛІКІ ПЕРАД НАВУКАЙ ПАСТАВІЛА ЦЁПЛАЯ ЗІМА

Дырэктар Інстытута аховы раслін Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Запрудскі ўсё жыццё прысвяціў аграрнай навуцы. Навуковая ступень доктара сельскагаспадарчых навук прысуджана яму за распрацоўку і ўкараненне навукова абгрунтаванага комплексу асноўных агратэхнічных і аграхімічных прыёмаў тэхналогіі апрацоўкі кармавых бабоў.

Пытанне Прэзідэнта да Аляксандра Запрудскага было на злобу дня — у сувязі з неверагоднай зімой чаго чакаць вясной? «Ужо маніторым, пачынаем з Брэсцкай вобласці, адсочваем фітасанітарную абстаноўку. Вядома, яна будзе няпростай. Паглядзім, які акажацца люты, перададуць замаразкі. У цэлым, гэта спрыяльна складваецца для нас і неспрыяльна — для насякомых-шкоднікаў. Трымаем руку на пульсе, пры неабходнасці праводзім даследаванні. У нас цяпер на кантролі ўсе вобласці і раёны ў плане аховы раслін», — адказаў Аляксандр Запрудскі.

«На што трэба звярнуць увагу перш за ўсё?» — удакладніў кіраўнік дзяржавы. Па словах навукоўца, у першую чаргу трэба зважаць на масавы вылет шкоднікаў. Ён растлумачыў, што раней ключавым для вызначэння фітасанітарнай абстаноўкі быў красавік, а цяпер больш пільна трэба глядзець ужо ў лютым і сакавіку.

Да размовы на гэтую тэму падключыўся і старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір Гусакоў. Ён расказаў, што ў гэту выключную па сваім надвор'і зіму навукоўцы праводзяць даследаванні ўсіх пасеваў ва ўсіх рэгіёнах. Навукоўцы бяруць пробы, ацэньваюць стан азімых. На палове тэрыторыі змен ніякіх няма. Гэта значыць, расліны пакуль у спакоі, захоўваецца іх жыццяздольнасць. Калі будуць невялікія маразы, то падстаў для турботы і зусім не будзе. Гэта што датычыцца паўночных раёнаў — Віцебскай, Магілёўскай і часткі Мінскай абласцей. Што датычыцца заходніх і паўднёвых рэгіёнаў, то, паводле слоў Уладзіміра Гусакова, крыху пачаўся рух каранёвай сістэмы. «Калі будзе паніжэнне тэмператур, то ён прыпыніцца, і небяспекі не будзе. Але калі не прыпыніцца, пачне развівацца каранёвая сістэма і расліна пойдзе ў рост, то ў выпадку замаразкаў ніжэй за 10 градусаў расліна загіне», — адзначыў Уладзімір Гусакоў. Цяпер спецыялісты Акадэміі навук выпрацоўваюць рэкамендацыі для гаспадарак ва ўсіх рэгіёнах.

«На наступным тыдні замаразкі будуць і будуць скачкі да мінус 15 пры праясненнях. Мінус 12-13 градусаў замаразкі будуць, але праз тыдзень гэты скачок зноў пойдзе ўніз, і, як вы кажаце, мы спадзяёмся, што бліжэй да адзінкі або мінус трох маразы будуць. Калі поўдзень, то гэта не зусім страшна. Там у нас вялікіх маразоў пакуль не будзе. Можа, да сакавіка вытрымаем. Раней давядзецца падкарміць пасевы, паколькі яны зрасходавалі нямала пажыўных рэчываў», — сказаў Прэзідэнт.

## ЛЁНУ БЫЦЬ. АЛЕ ПАТРЭБЕН ВЫНІК

Аграрнай навукай займаецца і Віктар Богдан, загадчык лабараторыі селекцыі лёну-даўгунцу Інстытута лёну. Ён расказаў, што ў Беларусі сфарміраваны генафонд лёну-даўгунцу, які ўключае 628 узораў з 33 краін. Спецыялісты Інстытута лёну пастаянна працуюць над удасканаленнем селекцыйнага матэрыялу. Новыя сарты лёну-даўгунцу ствараюцца і беларускімі спецыялістамі.

«Калі шчыра, то я Інстытутам лёну не ўражаны. У сябе вы навучыліся вырошчваць лён. Але я даручаў стварыць сістэму па ўсёй краіне, каб была сістэма работы і быў вынік», — адзначыў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што ў краіне аднавілі насенныя станцыі, таму што без насення немагчыма развіваць культуру. Але належнага эфекту ад гэтага не атрымалі, падкрэсліў Прэзідэнт.

«Я прасіў бы вас перадаць дырэктару, і вы ўлічыце, што патрэбен вынік. Вы падумайце, як мы будзем вырошчваць лён», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што лён намаляваны на дзяржаўным гербе. І ўсім культурам, якія там прадстаўлены, у краіне аддаецца асаблівая ўвага. Але лён адстае. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на Аршанскім ільнокамбінаце выпускаюць выдатныя вырабы. І нашы людзі сталі ацэньваць іх належным чынам.

«Лёну быць. Але патрэбен вынік. У лабараторных умовах, у даследаваннях вы ствараеце добрыя ўзоры. А для вытворчасці не хапае. Таму давайце дамовімся, што з гэтага года мы пачнём прадметна рэалізоўваць хаця б тое, што я вам даручыў. Калі нешта трэба, вы скажыце. Толькі не расказвайце мне, што ў вас севазварот не той, што лён праз 5-7 гадоў вяртаецца на адно і тое ж месца і нехта гэтага не хоча рабіць. У вас у руках усе паўнамоцтвы і рэсурсы, рабіце. Нам патрэбен лён», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, лён патрэбен яшчэ і таму, што на прадукцыю з яго вялікі попыт на замежных рынках. А гэта грошы для краіны. Купляюць нават не самую якасную сыравіну. «Я ўжо не кажу пра добры лён. Гэта вопратка, пасцельная бялізна... Едзьце ў Оршу, паглядзіце: збіралі па ўсім свеце абсталяванне для таго, каб мадэрнізаваць ільнокамбінат. Ніхто лёнам ужо практычна не займаецца. Сабралі, зрабілі гэтыя лініі — робім сёння добрую прадукцыю. Навукоўцы пакуль адстаюць. Таму звярніце на гэта больш сур'ёзную ўвагу», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

## АКАДЭМІЯ КІРАВАННЯ ПАВІННА СТАЦЬ ВЯДУЧАЙ НЕ ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО ЯНА ПРЫ ПРЭЗІДЭНЦЕ

Дырэктар Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Леанід Мальцаў з рук кіраўніка дзяржавы атрымаў атэстат прафесара па спецыяльнасці «Паліталогія». Ён прызнаўся, што пад кіраўніцтвам Прэзідэнта атрымаў бясцэнны вопыт рэальнай канкрэтнай дзейнасці, які ён цяпер выкарыстоўвае ў сваёй навуковай і выкладчыцкай працы. «Сёння, калі супраць нас вядзецца гібрыдная вайна, вельмі важна, з аднаго боку, выкрываць ідэалагічныя дыверсіі і фэйкі, а з другога — развіваць нашу паліта-

Фота БелТА.







# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ»

лагічную навуку. У нас склалася ўнікальная паліталагічная сістэма. Самае галоўнае, што яна адпавядае нашым нацыянальным інтарэсам, адпавядае нашым нацыянальным каштоўнасцям. Яна ўвесь час развіваецца і ўдасканальваецца. Як вядома, навука павінна асвятляць шлях практыкі. Таму навука павінна і можа прапанаваць кірунак далейшага развіцця нашай палітычнай сістэмы. Напрыклад, нам трэба развіваць далей пытанні грамадзянскай супольнасці, партыйнага будаўніцтва і гэтак далей. Нам не трэба кагосьці капіраваць. Нам трэба вывучаць досвед іншых дзяржаў, але выкарыстоўваць яго толькі ў адпаведнасці з нашымі нацыянальнымі каштоўнасцямі», — адзначыў прафесар. Паводле яго слоў, такая работа вядзецца. Напрыклад, навукоўцы працавалі над Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі, вядзецца работа над ідэалагічнай бяспекай, распачата навуковая работа па тэме ўмацаванні народаўладдзя.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў Акадэміі кіравання рыхтуюцца будучыя кіраўнікі і ад іх падрыхтоўкі залежыць стан усіх сфер жыцця нашага грамадства. Паводле яго слоў, там працуюць вопытныя, аўтарытэтныя спецыялісты, ёсць такія людзі і ў іншых ВНУ.

**Разам з тым, падкрэсліў кіраўнік, многія выкладчыкі, у акадэміях і ўніверсітэтах, «некалькі адарваліся ад жыцця». «Дык вось ваша задача — апусціць іх на гэтую грэшную зямлю, зрабіць практыка-арыентаваным наша навучанне і нашу навуку. На такіх спецыялістаў, як вы, я разлічваю», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да Леаніда Мальцава, падкрэсліўшы, што ён павінен пакінуць свой найбагацейшы вопыт у Акадэміі кіравання.**



Фота БелТА.

«Акадэмія павінна стаць вядучай, не таму што яна пры Прэзідэнце. А таму, што хутка гэтыя «акадэмікі» будуць кіраваць краінай, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я вас пераканаўча прашу, каб вакол вас сфарміравалася гэта здаровае ядро, якое будзе на зямлю апускаць тых, хто прывык хапаць чужы вопыт і пераносіць у Беларусь. Гэта не наш шлях. Мы ішлі ад зямлі. Мы рабілі тое, што трэба на зямлі, тое, што трэба людзям. І пацыху падымаліся наверх і стварылі тое, што народу падабаецца. Апошнія выбары гэта прадэманстравалі. Можа, камусьці не падабаецца. Але народу падабаецца. Мы гэта рабілі для людзей. І мы гэта павінны захаваць».

ГЭТАЯ ПЯЦІГОДКА НЕ ТОЛЬКІ МОЛАДЗІ, ГЭТАЯ ПЯЦІГОДКА ВУЧОНЫХ

Паводле слоў Прэзідэнта, роля вучоных павінна быць неймаверна высокай. Навукоўцаў усіх кірункаў: ад гісторыкаў, палітолагаў да вучоных, якія займаюцца сельскай гаспадаркай.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў сканцэнтравацца на гэтым. «Мы будзем удзяляць увагу і фундаментальнай навуцы, ад гэтага нікуды не падзецца. Але толькі тым кірункам, якія будуць замыкацца на наша жыццё, на нашу практыку», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што ў краіне няма дастатковага рэсурсу, каб развіваць фундаментальную навуку па ўсіх кірунках, разлічваючы, што ўсё можа спатрэбіцца. «Так, веды за плячыма насіць не будзеш, яны заўсёды спатрэбяцца. Але ў нас няма столькі сродкаў, і неабходнасці сёння такой няма. Таму што сёння для таго, каб выжыць, для таго, каб рухацца наперад і развівацца, трэба займацца тым, што мы ўмеем рабіць, і тым, што жыццё патрабуе», — арыентуе кіраўнік дзяржавы. У прыклад ён прывёў электрычнасць. Калі жыццё запатрабавала развіваць гэтую сферу — пабудавалі атамную электрастанцыю, асвоілі электратранспарт, электрычнасцю сталі абаграваць дамы. «Але калі мы гаворым пра электратранспарт, то тут павінен быць засяроджаны адзін з кірункаў нашых навукоўцаў. І тут мы, канешне, будзем нашых людзей падтрымліваць. Трэба лакалізаваць транспарт, — сказаў Прэзідэнт. — Мы ўсё ўмеем рабіць. Нас губіць лянота. Мы лянівыя. Не хачу ўсім агулам гэта прыпісаць. Але гэта лянота нас загубіць». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што не трэба купляць у партнёраў тое, што можна зрабіць у Беларусі. «Тое, што патрабуе жыццё, нашы людзі, — на гэтым павінна быць сканцэнтравана наша ўвага», — заявіў беларускі лідар. Паводле яго слоў, навука ў гэтым кірунку толькі пачынае развівацца. Але толькі пачынае. А для таго, каб выжыць, ужо на ўсю моц трэба быць у гэтым працэсе.

**«Выбары — не толькі перамога. Я ж разумею, чаго хочуць людзі. Але без саміх людзей мы гэта не зробім. Без навукі тым больш. Гэтая пяцігодка не толькі моладзі, гэтая пяцігодка вучоных. Мне не важна, якія вы будзеце: маладыя, пажылыя, сярэдняга ўзросту ці зусім старыя. Мне не важна. Галоўнае, каб вы маглі не толькі генерыраваць ідэі, але і сур'ёзна іх распрацоўваць, рабіць іх прыкладнымі длянашага жыцця, для нашай эканомікі. Гэта галоўнае. Будзе эканоміка — будзе і краіна».**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён схіляецца перад працай навукоўцаў і таму заўсёды, наколькі гэта магчыма, дапамагаў людзям навукі. «Але хачу падкрэсліць: у гэтай пяцігодцы ўвага будзе яшчэ больш пільнай. «Але гэта ўвага не агулам і чохам, — сказаў ён. — Тое, што патрабуецца на рынку і ў грамадстве, не толькі ў нашай, у любых краінах — тое мы будзем падтрымліваць. Тое, што прыносіць грошы, сродкі. Як бы ні было цяжка, апошнія грошы аддадзім. Але патрэбен вынік. Без выніку ніякай падтрымкі быць не можа. Выбачайце за шчырасць».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

## «У краіне створаны ўсе ўмовы для навуковай дзейнасці»

У размове з журналістамі **прафесар кафедры псіхіятрыі і наркалогіі, медыцынскай псіхалогіі БДМУ, доктар медыцынскіх навук Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА** прызналася, што атрымаць дыплом доктара навук з рук Прэзідэнта — гэта вялікі гонар і яшчэ большая адказнасць. «У дзяржаве створаны ўсе ўмовы для навуковай дзейнасці, атрымання аб'ектыўнай інфармацыі і яе сістэматызацыі, для таго, каб атрымаць рашэнні і працаваць на карысць любімай краіны. Навука заўсёды ўпрыгожвае. І вельмі прыемна, калі твае гіпотэзы атрымліваюць навуковыя пацвярджэнні. Гэта і ёсць прафесіяналізм, які не дае спыніцца на дасягнутым», — адзначыла яна. Даведаліся ў герояў дня, якія яшчэ гіпотэзы і вынікі іх навуковай працы ўпрыгожваюць краіну.

Ступень **доктара хімічных навук** прысуджана **Сіямаку ШАХАБУ** за распрацоўку фізіка-хімічных асноў стварэння плёначных палярызатараў на аснове афарбаваных палімераў і палімерных кампазітаў для вадкакрышталічных індыкатараў і прылад оптаэлектронікі. Ён растлумачыў, што аптычныя палярызатары шырока выкарыстоўваюцца ў оптаэлектроніцы, для стварэння гадзіннікаў, электронных табло. Сёння гэта вельмі актуальна. Сіямак Шахаб расказаў, што ён родам з Ірана. «Я заўсёды стараўся стварыць тэхнічны, тэхналагічны мост паміж нашымі краінамі, каб мы маглі больш цесна працаваць і прасоўваць свае навуковыя даследаванні, — адзначыў вучоны. Разам з тым Сіямак Шахаб адзначыў, што ў Беларусі створаны ўсе належныя ўмовы для камфортнай і плённай навуковай дзейнасці. «Самае галоўнае — бачыць гэтыя магчымасці і выкарыстоўваць іх тады, калі трэба», — падкрэсліў ён.

**Прафесар кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій БДУ Аляксандр ПАЛЯКОЎ** якраз і займаецца прыкладной навукай. Яго сфера навуковых інтарэсаў звязана з валаконнай оптыкай. На аснове вынікаў даследаванняў у яго дысертацыйнай рабоце быў сфармуляваны новы метад вымярэнняў, прапанаваны фундаментальныя асновы пабудовы розных высокадакладных валакно-аптычных сістэм. Іх асаблівасць у тым, што яны даволі ўніверсальныя і, вымяраючы толькі канструкцыю адчувальнага элемента, можна вымяраць розныя фізічныя велічыні. Такія прылады могуць выкарыстоўвацца для вымярэння тэмпературы, высакавольтнага напружання, канцэнтрацыі кіслароду.

«Прыкладной» навукай можна смела лічыць і медыцынскія даследаванні, бо ад іх залежыць самае каштоўнае для дзяржавы — жыццё людзей. Вучоная ступень **доктара медыцынскіх навук** прысуджана **рэктару Віцебскага дзяржаўнага ордэна дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта Аляксею ЧУКАНАВУ**. Сфера яго навуковых інтарэсаў — высокаэфектыўныя метады дародавай дыягностыкі парокаў развіцця ў плода, якія садзейнічаюць зніжэнню перынатальных страт і інваліднасці дзяцей. Гэтыя метады ўжо ўкаранілі ў клінічную практыку міжраённых рэсурсных цэнтраў прэнатальнай дыягностыкі. Аляксей Чуканаў звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі ўдзяляецца вялікая ўвага падрыхтоўцы кадраў у галіне медыцыны, на што ў тым ліку накіравана дзейнасць і Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэта. «Чалавек, прыходзячы да ўрача, павінен быць упэўнены ў тым, што атрымае якасную медыцынскую дапамогу. Зносіны ўрача з пацыентам — гэта таксама надзвычай важна, і гэтаму аспекту ў падрыхтоўцы і выхаванні кампетэнтных прафесіяналаў мы аддаём вялікую ўвагу», — расказаў рэктар.

**Ірына ВЕРАС, прафесар кафедры акушэрства і гінекалогіі інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ**, атрымала ступень доктара медыцынскіх навук за распрацоўку і ўкараненне ў практыку новага комплексу праграм дыягностыкі, прагназавання і лячэння пасляродавага эндаметрыту. «Ужо са студэнцкіх гадоў я займалася пошукам новых метадаў лячэння, дыягностыкі запаленчых захворванняў у жанчын. Мая работа прысвечана здароўю маці, лячэнню запаленчага працэсу ў матцы, якія звязаны з цяжкімі родамі. Мы робім усё, каб захаваць дзетародны орган здаровым пасля родаў, каб жанчына магла мець дзяцей у далейшым. Мы распрацавалі і ўкаранілі метады дыягностыкі, лячэння. Гэта дазваляе таксама знізіць колькасць пасляродавых ускладненняў. Работа заняла доўгі час — больш за 10 гадоў. Мы працягваем даследаванні. Новыя вынікі будуць укаранёны ў практыку. Упэўнена, гэта спрыяльна адаб'ецца на дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, — падзялілася яна. Галоўным вынікам сваёй працы доктар назвала шчаслівых маці і іх здаровых дзяцей.

Напрыканцы сустрэчы Прэзідэнт пажадаў вучоным не проста працаваць над сваімі даследаваннямі, але рыхтаваць маладое пакаленне, перадаваць свае веды вучням, каб усё было не дарма. **Ірына КІТУРКА** не толькі вывучае дзяржаўную мытную службы 1764—1785 гадоў, за што **атрымала навуковую ступень доктара гістарычных навук, але і кіруе Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы.** Таму аб прыцягненні моладзі ў навуку рэктар ведае як ніхто іншы. «Самае галоўнае — зацікавіць студэнтаў. Я абсалютна ўпэўнена, што тут галоўную ролю адыгрывае асобасны фактар. У час вучобы важна, якую пазіцыю займае навуковы кіраўнік. Калі ён сам любіць навуку, жыве ёю, то зможа зацікавіць іншых», — падзялілася сакрэтам Ірына Кітурка.

## Задача ад Першага

***Антарктыка — проста ідэальны прыклад непрадузятых і канструктыўных адносін паміж краінамі. Па вялікім рахунку, навуковыя дасягненні ў такіх глабальных кірунках, як заваяванне космасу, развіццё атамнай энергетыкі, супрацьдзеянне пандэміям, асваенне палярных рэгіёнаў, з'яўляюцца важным інструментам міжнароднай дыпламатыі.***

*Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з навукоўцамі і ўдзельнікамі беларускіх антарктычных экспедыцый. 17 кастрычніка 2024 года*

# Тайны шостага кантынента

Вывучэнне Антарктыды — стратэгічная задача, рэалізацыя якой была распачата суверэннай Беларуссю амаль два дзесяцігоддзі таму, падкрэслівае н**ачальнік Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў Уладзімір РЫЖЫКАЎ:**

— Сёння наша рэспубліка ў ліку 58 краін, што вядуць на шостым кантыненце даследчую дзейнасць, і адна з нямногіх, якія маюць там станцыі. Навуковыя даследаванні праводзяцца па шэрагу кірункаў, якія замацаваны ў дзяржаўнай праграме. Перш за ўсё гэта класічныя даследаванні, якія курыруе Навуковы камітэт па вывучэнні Антарктыкі SCAR. Наша краіна — асацыяваны член дадзенай арганізацыі, і мы прытрымліваемся патрабаванняў, якія яна праводзіць. Гэта такія кірункі, як, напрыклад, вывучэнне фізікі атмасферы (гэтым займаюцца спецыялісты Інстытута фізікі НАН). Для вывучэння аэразольнага складу паветра беларускімі навукоўцамі распрацаваны ўнікальныя прыборы па дыстанцыйным зандзіраванні атмасферы: яны ўстаноўлены на беларускай арктычнай станцыі. Даныя паступаюць у міжнародную сетку Aeronet, якая дазваляе рабіць высновы аб складзе атмасферы на планеце, утрыманні аэразольных часціц і ў цэлым аб «здароўі» азонавага пласта Зямлі. Гэта навуковыя даследаванні фундаментальнага характару, якія маюць сусветнае значэнне, і Беларусь робіць у іх свой унёсак.

Яшчэ адзін ключавы кірунак — біялагічныя даследаванні, маніторынг біяскладніка на кантыненце. Экасістэмы Антарктыды ўнікальныя і вельмі ўразлівыя, а змяненне клімату закранула і гэты рэгіён. І рэакцыя жывых арганізмаў дае магчымасць рабіць глабальныя высновы. Арктычныя экасістэмы эталонныя, а таму могуць служыць індыкатарамі розных працэсаў, звязаных з кліматычнымі зменамі ў цэлым на планеце. Ёсць шэраг экалагічных кірункаў: Беларусь далучылася да Пратакола па ахове навакольнага асяроддзя, які быў ратыфікаваны ў 1991 годзе.

Што датычыцца выкарыстання напрацовак нашых палярнікаў у рэальных сектарах эканомікі (пра гэта не раз гаварылася на самым высокім дзяржаўным узроўні), то прывяду толькі некалькі прыкладаў. Гэта і інавацыйны прэпарат «Вегетацін» для абароны раслін, распрацаваны на аснове арктычных мікраарганізмаў, які ўжо выкарыстоўваецца на палях Беларусі, і даследаванні, звязаныя з хімічным складам арктычных мохападобных і лішайнікаў: атрыманы рэчывы, што паскараюць згусальнасць крыві. На іх аснове будуць распрацоўвацца інавацыйныя прэпараты для загойвання ран, рэабілітацыі ў пасляаперацыйны перыяд. Гэта і сумесныя даследаванні Інстытута эксперыментальнай батанікі і Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь з РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі і РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, накіраваныя на стварэнне прэпаратаў на аснове выдзеленых з арктычнай флоры рэчываў для папярэджання раку.

Пакуль наша краіна мае, паводле Дагавора аб Антарктыцы, статус назіральніка. У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дастаткова высока ацэньваюць шанцы нашай краіны на атрыманне ў найбліжэйшыя гады кансультатыўнага статусу. У планах навукоўцаў, працягнуўшы будаўніцтва станцыі ў Антарктыдзе, атрымаць з часам магчымасць праводзіць на лядовым кантыненце круглагадовыя навуковыя назіранні.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

МІЖРЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ЭФЕКТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА

## Беларускі бок рыхтуецца да правядзення XII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі

Традыцыйнае мерапрыемства, якое штогод ладзіцца пад эгідай Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу, сёлета пройдзе 25—27 чэрвеня ў ніжнім Ноўгарадзе. Яго тэма — «Моладзь Беларусі і Расіі — нашчадкі Вялікай Перамогі і будучыня Саюзнай дзяржавы».



Адкрываючы пасяджэнне беларускай часткі арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** выказала ўдзячнасць за добрую падрыхтоўку і высокі арганізацыйны ўзровень папярэдняга форуму, які ўпершыню праходзіў адразу ў трох гарадах (Віцебску, Полацку і Наваполацку). Асобныя словы падзякі прагучалі за рэальныя вынікі праведзенай работы.

### «РЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА — АДЗІН З АСНОЎНЫХ КІРУНКАЎ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ»

«Калісьці прынятае абсалютна правільнае мудрае рашэнне сёння дае такія цудоўныя вынікі, — акцэнтавала ўвагу спікер, кажучы аб значнасці гэтага мерапрыемства. — Па прыкладзе работы форуму Расіі і Беларусі мы ўжо працуем з Узбекістанам і з іншымі краінамі. Мне бачыцца, што рэгіянальнае супрацоўніцтва — гэта адзін з асноўных кірункаў у нашым узаемадзеянні паміж рознымі краінамі».

Аб эфектыўнасці рэгіянальнага супрацоўніцтва, па словах спікера, ішла размова і ў ходзе леташніх візітаў парламентарыяў у Кітай і Азербайджан. «Гэта вельмі важна, калі ўзаемадзейнічаюць гарады, раёны, адміністрацыі, — канкрэтызавала Наталля Качанава. — Аб гэтым казаў Прэзідэнт нашай краіны, калі адзначаў ролю рэгіянальнага супрацоўніцтва: гэта можа быць хутчэй і больш якасна, чым вырашэнне нейкіх іншых пытанняў, якое часам зацягваецца».



Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што за сваю гісторыю Форум рэгіёнаў стаў узорам канструктыўнай дыялогавай пляцоўкі для вырашэння і абмеркавання найшырэйшага кола перспектыўных кірункаў беларуска-расійскага супрацоўніцтва, новых ідэй і ініцыятыў.

«За 11 гадоў яго правядзення разгледжаны актуальныя аспекты развіцця ўзаемадзеяння ў галіне аграрнай, прамысловай палітыкі, сацыяльнай, інавацыйнай і культурнай сферах, прадметна абмяркоўваліся пытанні захавання нашай агульнай гістарычнай памяці, патрыятычнага выхавання, пабудовы інавацыйнай эканомікі Саюзнай дзяржавы, — канкрэтызавала спікер. — Усяго на форумах рэгіёнаў падпісана 588 пагадненняў шматлікага ўзроўню, заключана камерцыйных кантрактаў на суму больш як 20,5 мільярда беларускіх рублёў».

### «МЫ ГАНАРЫМСЯ СВАЁЙ КРАІНАЙ, СВАІМ НАРОДАМ»

Наталля Качанава нагадала, што сёлета мы будзем адзначаць 80-годдзе Вялікай Перамогі, а таму тэматыка форуму, які пройдзе ў Ніжнім Ноўгарадзе, вельмі сугучная знакавай даце. «Мы ведаем, які для нас важны палітычны год 2025-ы: мы правялі выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, — дадала яна. — Мы чарговы раз ганарымся сваёй краінай, сваім народам, бо выбраны нашым Прэзідэнтам курс — на развіццё нашай краіны, на падтрымку нашага народа. І дзяржава для народа — гэта абсалютна правільная палітыка, дакладна вывераная».

Кажучы аб сустрэчы з губернатарам Ніжагародскай вобласці, якую спікер правяла ў снежні, гэты рэгіён вельмі сур'ёзна рыхтуецца да мерапрыемства. «Мы са свайго боку павінны падрыхтаваць усе неабходныя дакументы, — паставіла задачу спікер. — Мы ж працуем з вамі на працягу года: працуем над заключэннем кантрактаў і пагадненняў, рэалізацыяй тых пытанняў і задач, якія былі вызначаны на папярэднім форуме. У нас працуе Міжпарламенцкая камісія Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі, якая падводзіць вынікі таго, што зроблена за перыяд падпісання пагадненняў на форуме, як рэалізоўваюцца ўсе дамоўленасці. Гэта эфектыўная пляцоўка, калі мы падводзім такія вынікі».

Пры гэтым спікер акцэнтавала ўвагу на тым, што ўжо варта ажыццяўляць падрыхтоўку да XIII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі, які ў 2026 годзе пройдзе на беларускай тэрыторыі. «Нам трэба ўжо сёння вызначыць месца правядзення, вобласць правядзення, — канкрэтызавала дарučэнне Наталля Качанава. — Мы прынялі рашэнне, што будзем наведваць розныя рэгіёны нашай краіны».

Пасля заслухоўвання даклада кіраўніка арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі з беларускага боку намесніка старшыні Савета Рэспублікі Сяргея Хаменкі, які агучыў тэматыку секцыйных пасяджэнняў, Наталля Качанава адзначыла, што праз прызму маладзёжнай палітыкі работа секцый будзе весціся па ўсіх кірунках. «Гэта і прамысловасць, і сельская гаспадарка, і гуманітарная сфера», — удакладніла яна.

Спікер прапанавала ўважліва перагледзець тэматыку секцый і заклікала членаў аргкамітэта актыўна ўключыцца ў работу. «Гэта не прахадное мерапрыемства, — падкрэсліла яна. — Мы павінны ў рабоце нашых секцый разглядаць найбольш актуальныя сёння пытанні. Перш за ўсё праблемныя, каб прымаць рашэнні, якія для нас вельмі важныя».

Акрамя таго, Старшыня Савета Рэспублікі паставіла задачу максімальна прадставіць айчынныя прадпрыемствы на выставачных пляцоўках форуму, годна паказаць краіну ў мерапрыемствах культурнага характару.

**Вераніка КАНЮТА. Фота БелТА.**

Як адзначыў у размове з журналістамі **кіраўнік арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі з беларускага боку намеснік старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА,** асноўнай мэтай форуму з'яўляецца працяг узаемадзеяння па самых шматлікіх кірунках сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў дзвюх саюзных дзяржаў. «Мерапрыемства вельмі сур'ёзнае: па выніках XI Форуму Расіі і Беларусі было падпісана звыш ста кантрактаў на суму больш чым 1 мільярд 300 мільёнаў рублёў, — канкрэтызаваў ён. — У форуме ўдзельнічала больш як 300 суб'ектаў гаспадарання. Мы ставім цяпер рэальныя мэты па развіцці ўзаемадзеяння паміж рэгіёнамі дзвюх братэрскіх дзяржаў і, вядома, па развіцці ўзаемадзеяння паміж маладзёжнымі арганізацыямі і аб'яднаннямі. Кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, рэгіёнаў заўсёды вельмі актыўна ўдзельнічаюць у гэтым мерапрыемстве: яны ведаюць, што на падобных форумах набываюцца новыя партнёры, развіваюцца старыя сувязі і, вядома, пераймаецца той вопыт, які назапашаны ў дзвюх дзяржавах».

ЕЎРАЗІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

# ПАРАДАК ДНЯ «ПЯЦЁРКІ»

## Другі год запар тэмпы росту эканомік краін ЕАЭС перавышаюць сярэднесусветныя

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўчора прыняў удзел у пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета, якое прайшло сёння ў Алматы (Казахстан) у пашыраным складзе. Пасля яго завяршэння кіраўнік урада агучыў журналістам вынікі. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.



Фота БелТА.

У прыватнасці, Раман Галоўчанка адзначыў, што пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета, якое прайшло, дае старт мерапрыемствам высокага ўзроўню ў рамках старшынства Рэспублікі Беларусь у органах ЕАЭС у 2025 годзе:

— Абмеркаванне ўсіх пытанняў на парадку дня прайшло ў атмасферы адкрытага канструктыўнага дыялогу, што яшчэ раз пацвярджае прыхільнасць ідэям Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі і гатоўнасці вырашаць канструктыўна любыя пытанні ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы. Для нас бягучы год з'яўляецца адказным не толькі ў сувязі з тым, што на яго выпадае беларускае старшынства ў саюзе, але галоўным чынам і таму, што мы завяршаем пяцігадовую праграму развіцця ЕАЭС, стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года. Можна сказаць, завяршаецца «пяцігодка» Еўразійскага будаўніцтва.

Ён паведаміў, што да канца года неабходна падрыхтаваць базу для выканання ўсіх задач, якія закладзены ў дэкларацыях аб далейшым развіцці эканамічных працэсаў ЕАЭС да 2030 года і на перспектыву да 2045 года:

— Еўразійскі эканамічны шлях — мы плануем дадаваць гэтаму пільную ўвагу.

Прэм'ер-міністр праінфармаваў, што падчас пасяджэння быў разгледжаны шэраг важных пытанняў, вырашэнне якіх будзе накіравана на павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомік дзяржаў — членаў ЕАЭС:

— У прыватнасці, прынята рашэнне ўважліва падысці да такой тэмы, як падтрымка кааперацыйных праектаў у сферы аграпрамысловага сектара.

Абмеркаваны таксама актуальныя пытанні супрацоўніцтва ў мытнай сферы. Па ініцыятыве беларускага боку кіраўнікамі ўрадаў разгледжаны стан спраў з электронным гандлем таварамі ЕАЭС. Абмеркаваны прапановы аб стварэнні ў саюзе ўласнай сістэмы біржавых індыкатараў таварных рынкаў на ключавыя тавары. Заслухана таксама інфармацыя ЕЭК па макраэканамічнай сітуацыі дзяржаў-членаў. Абмеркаваны прапановы па забеспячэнні ўстойлівага эканамічнага развіцця ЕАЭС.

— Характэрна, што другі год запар тэмпы росту эканомік нашых краін перавышаюць сярэднесусветныя. Па выніках 2024 года плануецца павелічэнне сукупнага ВУП краін ЕАЭС на 4 %, што вышэй за ўзровень і папярэдняга года, і сярэднесусветнага, і сярэднееўрапейскага росту, — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Паводле яго слоў, усе члены міжурадавага савета сышліся ў меркаванні, што ў якасці прыярытэтных кірункаў эканамічнай палітыкі неабходна разглядаць прамысловую кааперацыю, навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, павышэнне тэхналагічнага суверэнітэту, забеспячэнне навукаёмістасці эканомікі і рэалізацыю актыўнай інвестыцыйнай палітыкі.

— Разгледжаны шырокі спектр тэм, якія закранаюць ключавыя пытанні нашага інтэграцыйнага супрацоўніцтва, — рэзюмаваў прэм'ер-міністр. — Пасяджэнне прайшло паспяхова, па ўсіх пытаннях прыняты канкрэтныя рашэнні.

# У ІНТАРЭСАХ ЧАЛАВЕКА ПРАЦЫ

## Учора ў Мінску прайшоў X з'езд Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

У прывітанні, якое дэлегатам з'езда накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, адзначаецца, што «сёння Федэрацыя робіць значны ўнёсак ва ўмацаванне суверэннай і незалежнай Беларусі, адстойвае прынцыпы сацыяльнай справядлівасці і роўнасці ў новай мадэлі грамадскага развіцця. Вырашэнне працоўных спрэчак, дапамога ў стварэнні належных умоў працы, удасканаленне заканадаўства ў інтарэсах чалавека працы забяспечылі вам высокі давер нашых людзей».

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ,** які зачытаў гэта прывітанне, ад сябе падкрэсліў, што ўнёсак Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў згуртаванне беларускага грамадства велізарны. Асабліва ён праявіўся падчас электаральнай кампаніі, калі ФПБ не толькі аб'яднала работнікаў розных сфер, але і арганізавала Цэнтр грамадскага назірання за выбарамі, актыўна ўдзельнічала ў культурных і грамадскіх акцыях, такіх як «Марафон адзінства».

**Старшыня ФПБ Юрый СЯНЬКО** у сваім выступленні звярнуў увагу на аб'яўленую ўказам кіраўніка дзяржавы пяцігодку якасці.

Усе пытанні, абазначаныя ў адпаведным указе кіраўніка дзяржавы, непасрэдна датычацца прафсаюзаў, таму што ў поўнай меры адпавядаюць статутным задачам, адзначыў Юрый Сянько. «У сувязі з гэтым нам неабходна ўзмацніць якасны складальнік нашай работы і вызначыць новыя кірункі ўзаемадзеяння з сацыяльнымі партнёрамі для дасягнення мэт, якія сёння стаяць перад нашай краінай», — сказаў ён.

Закрануў кіраўнік ФПБ і актуальную тэму калектыўных дагавораў. Паводле яго слоў, у гэтым кірунку ёсць вынікі, якімі можна ганарыцца. Напрыклад, толькі ў мінулым годзе ў арганізацыях і на прадпрыемствах упершыню было заключана звыш 600 калектыўных дагавораў (ці, як называюць іх прафсаюзы, «мясцовых канстытуцый»). Будзе далейшае напаўненне калдагавораў дадатковымі нормамі і гарантыямі, звярнуў увагу Юрый Сянько, што дае магчымасць не толькі падтрымаць людзей, але і матываваць іх на больш якасную і дзейсную работу, вырашаць пытанні па развіцці вытворчасці, што ў роўнай ступені важна як для наймальнікаў, так і для ўрада.

Разам з тым ён адзначыў, што па-ранейшаму ёсць сітуацыі, калі асобныя кіраўнікі, перш за ўсё прыватных арганізацый, зацягваюць або зусім адмаўляюцца ад падпісання калектыўнага дагавора. Такі падыход, як правіла, матывуецца тым, што ў заканадаўстве нормы аб заключэнні калектыўнага дагавора носяць рэкамендацыйны характар.

Таму ФПБ выступае з ініцыятывай па ўдасканаленні заканадаўства. У прыватнасці, гэта прапанова ўнесці ў Працоўны кодэкс норму, якая ўстанаўлівае дакладныя тэрміны падпісання калектыўнага дагавора.

* * *

У рамках з'езда была падпісана Генеральнае пагадненне паміж урадам Беларусі, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2025—2027 гады. Таксама дэлегаты з'езда аднагалосна перавыбралі Юрыя Сянько старшынёй ФПБ на новы пяцігадовы тэрмін.

**Паводле БелТА.**

## Тым часам

### У святле лічбы

**Актывізацыя ўзаемадзеяння ў галіне лічбавай трансфармацыі — адзін з прыярытэтаў беларускага старшынства ў ЕАЭС.**

***Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка, выступаючы ўчора на форуме «Digital Almaty 2025», які кіраўнік беларускага ўрада наведаў падчас двухдзённай рабочай камандзіроўкі ў Казахстан.***

Ён адзначыў, што прыярытэты работы нашай краіны на гэты перыяд вызначаны. І асобным пунктам у гэтым пераліку стаіць актывізацыя ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў ЕАЭС у галіне лічбавай трансфармацыі.

— Прычына зразумелая: рэалізаваць задачы, якія стаяць перад намі, сёння немагчыма без выкарыстання лічбавых тэхналогій, у прыватнасці тэхналогій штучнага інтэлекту. Але галоўнае — сумесная дзейнасць у гэтым кірунку, — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Ён адзначыў, што ўкараненне тэхналогій штучнага інтэлекту ў нашай краіне ідзе па двух асноўных кірунках.

Першы — забеспячэнне сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Тут асноўны ўпор робіцца на медыцыну, біятэхналогіі і фармакалогію.

— Камп'ютарны скрынінг і малекулярнае мадэляванне, апрацоўка вялікіх аб'ёмаў медыцынскіх і генетычных даных, пошук новых лекаў, ранняя дыягностыка і папярэджанне цяжкіх захворванняў — тыя кірункі, у якіх Беларусь дасягнула значных поспехаў, — пераканаці Раман Галоўчанка.

Другі кірунак — стандартызаваныя вытворчасці і аўтаматызацыя руцінных працэсаў:

— Рашэнні на базе штучнага інтэлекту — ужо цяпер складнікі ўнікальнай сельскагаспадарчай і горназдабыўной тэхнікі МТЗ, БЕЛАЗа і «Гомсельмаша». У сельскай гаспадарцы гэтыя машыны павялічваюць дзённую выпрацоўку больш чым на 20 % і скарачаюць страты ўраджаю на чвэрць.

Яшчэ адзін са стандартызаваных працэсаў — нарматворчасць. У Беларусі больш за 135 тысяч дзеючых заканадаўчых актаў. І тут штучны інтэлект — незаменны памочнік:

— Мы выкарыстоўваем яго для сістэматызацыі дакументаў, а пры распрацоўцы новага нарматыўнага акта — для выключэння дубліравання палажэнняў раней выдадзеных дакументаў. Менавіта так фарміруецца баланс пры выкарыстанні штучнага інтэлекту: на сённяшнім узроўні разумення тэхналогій яны павінны прымяняцца для стандартызаваных, строга рэгламентаваных працэсаў, але не для прыняцця складаных рашэнняў пра жыццё чалавека.

Раман Галоўчанка перакананы, што адным з кірункаў далейшага супрацоўніцтва павінна стаць пабудова адзінага еўразійскага рынку даных:

— Для кожнай краіны сёння важная лічбавая і тэхналагічная суверэннасць. Але ўсе разумеем, што дасягненне гэтай суверэннасці ў рамках адной краіны практычна немагчыма. І для ЕАЭС прыярытэтна не развіццё кожнай дзяржавы паасобку, а цесная кааперацыя, узаемадапаўняльнасць і абмен ведамі. Менавіта таму ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва і развіццё адзінага ўнутранага рынку ЕАЭС — адзін з асноўных рухавікоў прагрэсу нашых краін, — выказаў упэўненасць Раман Галоўчанка.

## Між іншым

### Беларусь — Іран: кантакты інтэнсіўна развіваюцца на ўсіх узроўнях

***Падчас знаходжання ў Алматы прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка таксама сустрэўся з першым віцэ-прэзідэнтам Ірана Махамадам-Рэза Арэфам.***

Бакі адзначылі, што сумеснымі намаганнямі Беларусь і Іран працягнуць мэтанакіраваную дзейнасць па нарошчванні ўзаемадзеяння на карысць дзвюх краін.

— Кантакты Беларусі і Ірана інтэнсіўна развіваюцца на ўсіх узроўнях: ад кіраўнікоў дзяржаў да міністэрстваў, ведамстваў і бізнесу, — звярнуў увагу Раман Галоўчанка.

Цяпер на парадку дня знаходзіцца некалькі вельмі важных сумесных праектаў для рэалізацыі ў сферы прамысловай кааперацыі: гаворка аб вытворчасці ў Іране трактарнай тэхнікі, камбайнаў, пасажырскай тэхнікі (аўтобусаў, электробусаў):

— Улічваючы тую ўвагу, якую кіраўніцтва Ірана аддае зялёнай энергетыцы, экалагічным праблемам, мы прапануем выкарыстоўваць наш вопыт у сферы электратранспарту, — акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр. Ён канстатаваў, што Беларусь — адзін з асноўных пастаўшчыкоў цяжкіх самазвалаў для горназдабыўной галіны Ірана.

Са свайго боку першы віцэ-прэзідэнт Ірана звярнуў увагу на добры ўзровень палітычных адносін паміж нашымі краінамі. Что датычыцца эканамічных планаў, ён перакананы: бакам неабходна прыкладаць больш намаганняў.

Ён згадаў, што сёлета Беларусь старшынюе ў ЕАЭС, а Іран атрымаў статус назіральніка пры Саюзе, і выказаў упэўненасць: бакі павінны працаваць разам.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*«Чым больш будзе на айчынным рынку беларускага, натуральнага і якаснага, тым лепш».*
***(На агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў 16 лютага 2024 года.)***

# СВАЁ — НАЙЛЕПШАЕ

## СПРАВЯДЛІВАСЦЬ І ФІНАНСАВАЯ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ

Станоўча паўплывала на развіццё спажывецкага рынку ўкараненне новых фінансавых прадуктаў, накіраваных на падтрымку як айчынных вытворцаў, так і насельніцтва, у мэтах захавання і павышэння ўзроўню жыцця — напрыклад, мэтавы спажывецкі крэдыт пад 4 % гадавых на тэрмін да трох гадоў ад «Беларусбанка» на набыццё дзясяткаў найменняў тавараў шэрагу беларускіх вытворцаў (мэблі, халадзільнікаў, тэлевізараў, пральных і пасудамыечных машын, керамічнай пліткі, сантэхнікі, будаўнічых матэрыялаў, веласіпедаў і інш.).

Каштоўнаснымі арыенцірамі сучаснага беларускага спажыўца з'яўляюцца справядлівасць і фінансавая ўпэўненасць, адзначылі ў БІСД. Адкрытасць узаемадзеяння па лініі «спажывец—прадавец» зніжае магчымасць маніпулявання паводзінамі пакупніка і робіць выбар тавараў больш усвядомленым. Таму пры гэтым для беларусаў прыярытэтнымі крытэрыямі з'яўляюцца якасць (83,8 % апытаных) і цэнавая даступнасць (69,3 %).

## СТАЎКА НА ЯКАСЦЬ І ДАСТУПНАСЦЬ

Сацыялагічныя замеры і кан'юнктурныя апытанні фінансавых інстытутаў паказваюць значнасць інструментаў спажывецкага крэдытавання і растэрміноўкі ў рамках спажывецкіх стратэгій насельніцтва. Менавіта за кошт прыцягнення пазыковых сродкаў адбываецца нарошчванне рознічнага тавараабароту нехарчовых тавараў.

Даступнасць якасных нехарчовых тавараў — адзін з элементаў забеспячэння дастойнага ўзроўню жыцця, падкрэсліў **аналітык БІСД Андрэй МІШЫН.** Для вырашэння гэтай сацыяльна арыентаванай задачы развіваюцца гандлёвая інфраструктура (аб'екты рознага маштабу і асартыменту, анлайн-пляцоўкі, сэрвісы дастаўкі), што павышае канкурэнцыю на рынку. Як вынік — канчатковы спажывец выйграе і ў цане, і ў якасці. Удзяляецца ўвага і пашырэнню даступных фінансавых інструментаў у сферы выдзялення пазыковых сродкаў: праграмы растэрміноўкі, крэдытныя прадукты на спецыяльных умовах.



Пры гэтым важным аспектам выступае нацэленасць дзяржавы на падтрымку айчыннай прадукцыі, што дае магчымасць стварыць мультыплікатыўны эфект: рост выручкі і прыбытку айчынных вытворцаў, рост заработнай платы на айчынных прадпрыемствах. У выніку павялічваюцца падатковыя паступленні ў бюджэты ўсіх узроўняў, што стварае рэсурсную базу для далейшага прасоўвання сацыяльна арыентаванай палітыкі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апошні месяц зімы павінен прыемна здзівіць беларусаў, таму што чакаюцца фінансавыя карэкціроўкі. Рост даходаў адчуюць як пенсіянеры, так і маці, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзяцей. Пры гэтым павысіцца падатковая нагрузка для тых, хто займаецца здачай жылля. Падрабязнасці — у нашым аглядзе.



Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у прыватнасці, паведаміла, што **павялічваюцца памеры дапамог сем'ям з дзецьмі.**

Так, з 1 лютага да 31 ліпеня 2025 года памеры дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў, якія вылічаюцца з сярэднямесячнай заработнай платы, вырастуць на 10,8 % і складуць:

— на першае дзіця — Br861,42 (+Br83,61);

— на другога і наступных дзяцей — Br984,48 (+Br95,56);

— на дзіця-інваліда — Br1107,54 (+Br107,5).

З 1 лютага да 30 красавіка 2025 года павялічваюцца і памеры дзяржаўнай дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей, якія вылічаюцца з бюджэту пражытачнага мінімуму. Так, пры нараджэнні першага дзіцяці аднаразовая дапамога ў сувязі з яго нараджэннем складзе 10 БПМ, або Br4476,40. Пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ, або Br6266,96.

Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, з лютага будзе выплачвацца ў памеры 100 % БПМ (Br447,64), дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў (штомесячнае) — у памеры 50 % БПМ, або Br223,82.

Памер штомесячнай дапамогі сем'ям на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў на дзіця-інваліда — 70 % БПМ, або Br313,35, на іншых дзяцей у сям'і — Br223,82, або 50 % БПМ.

Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў складзе 100 % БПМ, або Br447,64 (з I і II ступенню страты здароўя і з III і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў), і 120 % БПМ, або Br537,17 (з III і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў); штомесячная дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага ВІЧ, — 70 % БПМ, або Br313,35.

У міністэрстве звярнулі ўвагу, што пры выхаванні ў сям'і дваіх і больш дзяцей, адно з якіх ва ўзросце да 3 гадоў, выплачваюцца дзве дапамогі: на дзіця да 3 гадоў (40 % СЗП) і дзіця (дзяцей) ад 3 да 18 гадоў (50 % БПМ). Сумарны памер дзвюх дапамог складзе Br1208,3.

## БПМ ПАВЯЛІЧЫЦЦА НА 2,2 %

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны таксама інфармуе, што з 1 лютага ўстаноўлена новая велічыня бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Яго памер вырасце на 9 руб. 84 кап. Замест ранейшых 437 руб. 80 кап. БПМ складзе 447 руб. 64 кап. Такое значэнне будзе дзейнічаць з 1 лютага да 30 красавіка.

Да таго ж устаноўлены памеры БПМ па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах, у прыватнасці:

— для працаздольнага насельніцтва — 477 руб. 22 кап. (раней 468 руб. 58 кап.);

— пенсіянераў — 326 руб. 72 кап. (раней 319 руб. 93 кап.);

— дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — 280 руб. 87 кап. (раней 274 руб. 9 кап.);

— дзяцей ад 3 да 6 гадоў — 376 руб. 96 кап. (раней 365 руб. 59 кап.);

— дзяцей ад 6 да 18 гадоў — 442 руб. 76 кап. (раней 436 руб. 16 кап.).

Нагадаем, што гэта першая карэкціроўка БПМ сёлета. Пераглядаюць паказчык чатыры разы на год: у лютым, маі, жніўні і лістападзе.

## ПЛЮС 10 % ДА ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ

Усе віды працоўных пенсій, а таксама за выслугу гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля з 1 лютага павысяць адразу на 10 %. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы.

Па даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны краіны, калі параўнаць люты мінулага года з лютым сё-


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

**Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)**

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н<br>Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Вторые повторные публичные торги (аукцион). Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) размещалось 26.12.2024 в г. «Звязда» № 251 (30385), стр. 7**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (квартира) 2, по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск. ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 93,9 кв. м. Количество жилых комнат: 3 | 228 313,14 бел. руб. без НДС | 216 897,48 бел. руб. без НДС |
| 2 | Изолированное помещение (квартира) 4 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск. ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 93,8 кв. м. Количество жилых комнат: 3 | 227 986,21 бел. руб. без НДС | 216 586,90 бел. руб. без НДС |
| 3 | Изолированное помещение (квартира) 21 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск. ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 160,3 кв. м. Количество жилых комнат: 5, этаж: 5-й и 6-й | 353 200,40 бел. руб. без НДС | 335 540,38 бел. руб. без НДС |
| 4 | Изолированное помещение (квартира) 23 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск. ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,5 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 288 141,33 бел. руб. без НДС | 273 734,26 бел. руб. без НДС |
| 5 | Изолированное помещение 25 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск. ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,2 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 287 487,47 бел. руб. без НДС | 273 113,10 бел. руб. без НДС |
| 6 | Изолированное помещение 26 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск. ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 115,2 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 273 102,55 бел. руб. без НДС | 259 447,42 бел. руб. без НДС |
| **Вторые повторные публичные торги (аукцион). Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) размещалось 14.01.2025 в г. «Звязда» № 7 (30395), стр. 10** | | | |
| 7 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-51297 общей площадью 179,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 63 | 28 528,00 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 11 411,20 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 8 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-25779 общей площадью 163,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 65 | 25 528,00 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 10 211,20 бел. руб. с учетом НДС 20 % |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях.
Перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона) – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 0,7 % в зависимости от конечной цены продажи лота, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 11.02.2025. Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 10.02.2025 г. до 17.00.
Начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) — проводит вторые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже **зданий и сооружений,** расположенных по адресу: **Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15,** принадлежащих ОАО «Мозырский спиртоводочный завод» (Антикризисный управляющий — ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) — производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016). С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на сайте организатора аукциона www.cpo.by и по тел.: +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна); +375 29 8717025 (Валерий Петрович).

**Аукцион состоятся 18.02.2025 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512. Заявки принимаются с 9.00 03.02.2025 по 17.02.2025 до 17.00 по указанному адресу

# ВА ЎМОВАХ НОВАЙ КАНКУРЭНЦЫІ



Сусветны трэнд — развіццё электроннага гандлю, што характэрна ў тым ліку і для Беларусі. Па прагнозах экспертаў, каля чвэрці сусветных рознічных продажаў да 2027 года будзе ажыццяўляцца ў інтэрнэце, большая частка заказаў — праз маркетплэйсы, адзначыла **аналітык БІСД Ірына РУСАК.**

Большасць айчынных дзяржаўных прадпрыемстваў з'яўляюцца прыхільнікамі традыцыйных каналаў рэалізацыі прадукцыі, але варта мець на ўвазе, што атрыманне эканамічнай выгады ад работы ў інтэрнэце ўжо бясспрэчнае. Сярод лідараў, якія паспяхова адаптаваліся ў продажах на маркетплэйсах, можна назваць Mark Formelle, Milavitsa, Avalon, Relouis, Conte, «Амі Мэбля». Высокімі аб'ёмамі рэалізацыі вылучаюцца кандытарскія фабрыкі «Камунарка» і «Спартак», вытворцы малочнай і мясной прадукцыі «Квінфуд» (ГМ «Гродфуд»), «Бярозаўскі мясакансервавы камбінат», «Беллакт», «Рагачоўскі ММК». Гэты вопыт варта маштабаваць і на іншыя найбуйнейшыя прадпрыемствы краіны.

Не толькі даступнасць, зручнасць дастаўкі тавараў, прывабная цана і магчымасць атрымання ў найкарацейшыя тэрміны з'яўляюцца перавагамі работы маркетплэйсаў у Беларусі. Інтэрнэт-агрэгатары ўплываюць і на стратэгіі паводзін насельніцтва, стымулююць спажывецкі і імпульсіўны попыт, змяняюць структуру вытворчасці тавараў.

Сёння важна выбудоўваць механізмы работы інтэрнэт-агрэгатараў, прапрацоўваць перспектывы адаптацыі суб'ектаў гандлю да работы ва ўмовах новай канкурэнцыі ў сетцы інтэрнэт, абараняць уласных вытворцаў і змагацца з манапалізацыяй лічбавых рынкаў замежнымі буйнымі гульцамі.

## АПТЫМАЛЬНАЯ МАДЭЛЬ

Нягледзячы на імклівае распаўсюджванне маркетплэйсаў у краіне і шырокую прадстаўленасць пунктаў выдачы тавараў не толькі ў буйных, але і ў малых гарадах, для большасці грамадзян аптымальнай таксама застаецца купля адзення ў беларускіх магазінах. Крамы замежных брэндаў і сэканд-хэнды больш папулярныя сярод моладзі. Аб гэтым прынамсі сведчаць вынікі тэматычнага анлайн-апытання, якое было праведзена летась у верасні.

У цэлым насельніцтва схільнае захоўваць звыклую мадэль паводзін пры здзяйсненні пакупак і таму адчувальна рэагуе як на павышэнне цэн, так і на скарачэнне асартыменту тавараў. У гэтым кантэксце людзі падтрымліваюць меры па стрымліванні інфляцыі і забеспячэнні справядлівага цэнаўтварэння, якія прымаюцца дзяржавай.

## ШЫРОКІЯ МАГЧЫМАСЦІ

Ацэньваючы ўзровень свайго дабрабыту, большасць насельніцтва адзначае даступнасць для іх прадуктаў харчавання і адзення. Для набыцця дарагіх тавараў працяглага карыстання грамадзяне выкарыстоўваюць інструменты фінансавага запазычання (спажывецкія крэдыты, растэрміноўка), адчуваючы ўпэўненасць у сваіх даходах.

Пры планавым паказчыку на мінулы год індэкса спажывецкіх цэн не больш за 6 % у гадавым выражэнні па выніках лістапада 2024 года ён склаў 5,5 %. Пры гэтым рэальныя наяўныя даходы насельніцтва выраслі летась за студзень—лістапад на 9,5 %, а рэальная заработная плата — на 12,9 %. Гэта садзейнічае росту пакупніцкай здольнасці насельніцтва.

Як заўважылі ў Беларускім інстытуце стратэгічных даследаванняў, разглядаючы асобныя катэгорыі харчовых тавараў, нельга не адзначыць рост (за апошнія пяць гадоў) спажывання на душу насельніцтва малака і малочных прадуктаў да 25,1 кілаграма на чалавека за месяц, мяса і мясных прадуктаў — да 7,2 кг, гародніны і бахчавых — да 8,4 кг, садавіны і ягад — да 5,7 кг.

Аналіз дынамікі спажывецкіх расходаў паказвае, што па выніках студзеня—верасня 2024 года адзначалася паступовае зніжэнне долі харчовых тавараў у спажывецкім кошыку з больш паскораным ростам выдаткаў у сегменце нехарчовых тавараў. Як заўважылі ў БІСД, у цэлым забяспечваецца адносная стабільнасць спажывецкіх пераваг беларусаў.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

БУДЗЬЦЕ Ў КУРСЕ

# ШТО МЯНЯЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ З 1 ЛЮТАГА?

летняга, то чакаецца прыбаўка да працоўных пенсій у памеры да 120 руб. А паводле папярэдняй ацэнкі ведамства, сярэдні памер пенсіі беларусаў у лютым дасягне адзнакі ў 930 руб.

Дарэчы, у Беларусі працоўныя пенсіі прызначаны 2,3 млн грамадзян.

## РОСТ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕНСІЙ

Сацыяльныя пенсіі, даплаты і надбаўкі да пенсій пераглядаюць разам з бюджэтам пражытачнага мінімуму на душу насельніцтва чатыры разы на год.

Першае павышэнне адбудзецца ўжо з 1 лютага. Так, сацыяльная пенсія для асоб, якія дасягнулі 60 гадоў — для жанчын і 65 гадоў — для мужчын, з апошняга месяца зімы вырасце да сумы 424 руб. 74 кап.

Інваліды І групы, у тым ліку з дзяцінства, будуць атрымліваць 492 руб. 40 кап. Інваліды з дзяцінства ІІ групы — 425 руб. 26 кап. Сацыяльныя выплаты інвалідам ІІ групы і дзецям у выпадку страты карміцеля з наступнага месяца вырасце да 380 руб. 90 кап. Грамадзяне з ІІІ групай інваліднасці могуць разлічваць на 335 руб. 73 кап.

Што датычыцца «ўзроставых» даплат да пенсій, то яны таксама вырастуць суразмерна БПМ. Беларусы, якім споўнілася 75 гадоў і больш, атрымаюць прыбаўку да пенсіі ў памеры 83 руб. 93 кап., а тыя, хто перасягнуў мяжу ў 80 гадоў, «зарабілі» грашовы бонус у суме 111 руб. 91 кап.

## ВЫРАСЦЕ ДАПАМОГА НА ПАХАВАННЕ

Сям'я памерлага мае права на атрыманне дапамогі на пахаванне памерлага. Прычым яго памер карэктуецца штомесяц. Сума выплаты залежыць ад сярэдняй зарплаты па краіне, якая налічана работнікам за два месяцы да наступлення ў сям'і сумнай падзеі.

Па даных Белстата, намінальная налічаная сярэдняя зарплата ў Беларусі ў снежні склала 2693 руб. 90 кап. І гэтая лічба вышэй за лістападаўскае значэнне на 362 руб. 10 кап. У канцы восені сярэдняя зарплата па краіне была роўная 2331 руб. 80 кап.

Звярнуцца па дапамогу можа паўналетні блізкі сваяк ці сябар сям'і, які ўзяў на сябе арганізацыю пахавання памерлага. Атрымаць выплату можна на працягу 6 месяцаў з дня смерці.

## ЗМЕНІЦЦА ПАДАТАК ЗА ЗДАЧУ КВАТЭР

Згодна з айчынным заканадаўствам, калі грамадзянін атрымлівае прыбытак ад здачы ў арэнду жылля, ён абавязаны заплаціць падаходны падатак. З 1 лютага плаціць у бюджэт давядзецца больш.

Стаўкі за здачу кватэры ўнаём вар'іруюцца ў залежнасці ад населенага пункта. Больш за ўсё давядзецца заплаціць падаткаў у сталіцы Беларусі. За кожны пакой, які здаецца, уладальнік кватэры абавязаны ўнесці 50 руб. У абласных цэнтрах і Мінскім раёне падатковая стаўка будзе складаць 46 рублёў за кожны пакой. У буйных гарадах, такіх як Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Ліда, Маладзечна, Наваполацк і інш., арэндадаўцам трэба будзе выплачваць падатак на здачу жылля ў суме 31 рубля. У гарадах абласнога, раённага падпарадкавання, раённых цэнтрах падатковая стаўка за кожны здадзены пакой складае 22 рублі, у астатніх населеных пунктах — 16 рублёў.

## ЦЭНЫ НА ПЛАТНЫ ПРЫЁМ ВА ЎРАЧОЎ АБМЯЖУЮЦЬ

З 1 лютага пастановай Міністэрства аховы здароўя ўводзіцца парог цэн на платныя медыцынскія паслугі, якія аказваюць установы аховы здароўя ўсіх форм уласнасці — ад дзяржаўнай да прыватнай, у тым ліку ІП. Нагадаем, што раней цэнавае рэгуляванне не прымянялі ў дачыненні да кансультацый і прыёму ўрачоў-спецыялістаў, іх маглі ўстанаўліваць самі юрыдычныя асобы.

Каб «утаймаваць» цэны на рынку медпаслуг, устаноўлены гранічныя максімальныя тарыфы з улікам катэгорыі спецыяліста, яго вучонай ступені і звання:

— кансультацыя ва ўрача другой кваліфікацыйнай катэгорыі абыдзецца ў 35 руб.;

— наведванне спецыяліста першай кваліфікацыйнай катэгорыі каштуе 37 руб.;

— за прыём урачом вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі трэба ўнесці 41 руб.;

— кансультацыя з урачом-спецыялістам, акадэмікам НАН Беларусі, доктарам медыцынскіх навук самая дарагая — 57 руб.

Урэгуляваны і тарыфы ў выпадку, калі спатрэбіцца паўторны прыём вузкага спецыяліста ў медыцыне: цэннік вар'іруецца ад 21 да 32 руб.

Прычым гэтая пастанова Міністэрства аховы здароўя не рэгулюе расцэнкі на паслугі стаматолагаў.


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белвторресурсы»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 17.02.2025**

**Лот № 1:** автопогрузчик Львовский АП-40814, 1989 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 7 695,00 руб. Задаток – 770,00 руб.

**Местонахождение:** Республика Беларусь г. Слуцк, 2-й Пролетарский переулок, 12.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 12.02.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**



**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона** по продаже **имущества ликвидируемого юридического лица – унитарного предприятия по оказанию услуг «ВРТЭК» (УНП 291194141, г. Минск, ул. Жуковского, д. 11А, комн. 20)**

***Дата и время проведения торгов*: 11 февраля 2025 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 01 февраля 2025 года по 10 февраля 2025 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* УП по оказанию услуг «ВРТЭК» (УНП 291194141)**, в лице ликвидатора – ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт», директор Колыско А. А.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интеренет-сайте https://specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 09.00 до 17.00) +375 (29) 6847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 234 (30368) за 30.11.2024.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 7 (30395) за 14.01.2025



04.03.2025 г. в 12.00 состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Житковичлес» (УНП 400049968).

Повестка дня

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2024 год и основных направлениях деятельности общества в 2025 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества за 2024 г.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2024 г.
4. Об утверждении распределения прибыли общества по итогам работы за 2024 г., о выплате дивидендов за 2024 г.
5. Об утверждении основных направлений использования прибыли в 2025 году и первом квартале 2026 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии (ревизора) общества.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии (ревизора) общества.

Форма проведения собрания — очная.
Местонахождение ОАО «Житковичлес»: г. Брест, ул. Куйбышева, 13А/2-9, помещение 9-5.
Место проведения собрания: Брест, ул. Куйбышева, 13А/2-10, помещение 10-22.
Порядок регистрации участников собрания: 04 марта 2025 г. с 11.45 до 12.00. по месту проведения годового общего собрания акционеров. Для регистрации акционерам (представителям) необходимо иметь документы, удостоверяющие личность, представителям — дополнительно подтверждающие их полномочия.
Порядок ознакомления с материалами собрания: в рабочие дни с 14.30 до 15.00, начиная с 12 февраля 2025 года по месту проведения собрания.
Дата сбора реестра с целью составления списка акционеров для регистрации участников годового собрания — 03 февраля 2025 года. Наблюдательный совет



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец) на праве собственности

**Электронные торги состоятся 05.03.2025**

**Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 700/С-52650, площадь 459,8 кв. м (имеются изменения капитального строения, подлежащие государственной регистрации).
Начальная цена с НДС 20 % – 396 080,48 бел. руб.
Задаток – 19 804, 02 бел. руб.

Капитальное строение с инв. № 700/С-52650 расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000005000531 (право постоянного пользования, 0.5079 га). Доля: 618/10000.
Обременения: аренда.
**Адрес:** Республика Беларусь, Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, 169А.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.
На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 28.02.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

ВЕКАПОМНАЕ

# ЗАХАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ І ПАВАГА ДА ПОДЗВІГУ

## Эксперты прэзентавалі важныя кніжныя навінкі

Сёлета беларусы адзначаць найважнейшую дату — 80-годдзе Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. З гэтай нагоды ў краіне рэалізоўваецца нямала праектаў, грамадскасць у чаканні маштабных мерапрыемстваў. Аб сваіх ініцыятывах з нагоды гэтай вялікай даты, рэалізаваных сумесна з выдавецтвам «Беларусь», расказалі прадстаўнікі Генеральнай пракуратуры, Нацыянальнага архіва і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

### «ГЭТА БОЛЬ, ПЕРАНЕСЕНЫ ПРАЗ ПАКАЛЕННІ»

Выдавецтва «Беларусь» сумесна з Генеральнай пракуратурай працуюць над кнігай «Генацыд беларускага народа. Ка́ты 118-га карнага батальёна». Па словах **начальніка ўпраўлення па наглядзе за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Генеральнай пракуратуры — кіраўніка следчай групы па расследаванні крымінальнай справы па фактах генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны Валерыя ТАЛКАЧОВА,** у кнізе будуць прыведзены матэрыялы крымінальнай справы на ўкраінскіх нацыяналістаў, якія ўчынялі злачынствы на тэрыторыі Беларусі.

«Аўтары раскажуць пра тых, хто не быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, не быў у свой час асуджаны, — канкрэтызаваў ён. — Мы правялі ўжо крымінальныя працэсы ў адносінах да Уладзіміра Катрука, Канстанціна Смоўскага. Вярхоўны Суд нашай краіны прызнаў іх вінаватымі па ўсіх тых пунктах абвінавачвання, якія былі ім інкрымінаваны. Мы падрабязна спыніліся на біяграфіі карнікаў, прычынах, чаму іх прытулілі на тэрыторыі Канады і Злучаных Штатаў Амерыкі, чаму яны так і не былі выдадзены і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці яшчэ пры жыцці. Чытачы змогуць азнаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, з прамовай дзяржаўнага абвінаваўцы па гэтых двух працэсах. Там жа будуць размешчаны і прыгаворы Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь».

Асаблівасцю выдання, прысвечанага карным аперацыям, з'яўляецца спасылка аўтараў на канкрэтныя дакументы. «Гэта пратаколы допытаў сведкаў, якія раней ніколі не публікаваліся,



не былі вядомы шырокай грамадскасці, — удакладніў Валерый Талкачоў. — Кніга перакладзена на англійскую мову і выдадзена пад агульнай рэдакцыяй Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Андрэя Шведа. Генеральная пракуратура гэта выданне накіравала пракурорам шэрагу дзяржаў, у тым ліку краін Еўрасаюза».

### «ВАЖНА АДДАЦЬ ДАНІНУ ПАМЯЦІ ГЭТЫМ ЛЮДЗЯМ»

Да юбілею эпіцэнтра захавання памяці аб падзеях Другой сусветнай вайны выдавецтвам «Беларусь» была падрыхтавана кніга «Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 80 гадоў». «Гэта выданне вельмі насычанае па змесце, — адзначыла **намеснік галоўнага захавальніка фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Святлана ПРЫБЫШ.** — Тут ёсць розныя звесткі, якія будуць цікавыя не толькі музейшчыкам, але і ўсім чытачам, хто адкрые гэту кнігу. У ёй размешчана агульная інфармацыя пра музей, дэталі і факты пра яго».

У прыватнасці, чытачы могуць даведацца, якую плошчу займаюць музейныя экспазіцыі, хто кіраваў установай у розныя гады, іншыя факты з гісторыі музея, якая пачалася ў 1942 годзе са стварэння камісіі па зборы матэрыялаў Вялікай Айчыннай вайны.

Як заўважыла Святлана Прыбыш, гэта выданне ад іншых, прысвечаных музею, адрознівае глава «Гісторыя ў асобах». «Наш музей унікальны тым, што стварыўся яшчэ ў ваенныя гады, — падкрэсліла яна. — Першыя супрацоўнікі былі ўдзельнікамі падзей: франтавікамі, падпольшчыкамі, партызанамі. Менавіта яны заклалі тую аснову, падмурак, на якім у далейшым музей развіваўся, і плёнам іх працы мы цяпер карыстаемся. Таму важна аддаць даніну памяці гэтым людзям».

Гартаючы кнігу, можна віртуальна азнаёміцца з усімі экспазіцыйнымі заламі, найбольш каштоўнымі экспанатамі. «У нашым фондзе сёння налічваецца больш за 164 тысячы музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, — праінфармавала намеснік галоўнага захавальніка фондаў. — І кожны год ён папаўняецца на 1,2 тысячы адзінак. Фонд падзелены на 29 калекцый, пра якія ў кнізе расказалі іх захавальнікі».

Як паведаміла **загадчыца аддзела выдавецтва «Беларусь» Анжэла САДОЎСКАЯ,** сёлета ўвесь выдавецкі партфель найперш будзе прысвечаны тэме 80-годдзя Вялікай Перамогі. «Што б ні адбывалася ў гэтым свеце, якія б катаклізмы ў геапалітыцы ні здараліся, ёсць факты, дакументы, таму гісторыю перапісаць проста немагчыма, — перакананая яна. — Унікальнасць і самая вялікая каштоўнасць гэтых кніг у тым, што ўсе яны выдадзены на аснове дакументаў — гэта адзін вялікі дакумент».

**Вераніка КАНЮТА.**

ТЫМ ЧАСАМ

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

## У Віцебскай абласной бібліятэцы адбылася прэзентацыя выдання «Кніга Памяці. Рэспубліка Беларусь. Віцебская вобласць»

Гэта другі том міжнароднага праекта «Кніга Памяці. Рэспубліка Беларусь», прысвечаны 80-годдзю вызвалення паўночнага рэгіёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Інвестарам і каардынатарам праекта выступіў Фонд ветэранаў дыпламатычнай службы Расійскай Федэрацыі.

Важкі ўнёсак у стварэнне Кнігі Памяці зрабілі Віцебскае кадэцкае вучылішча, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацкі музей баявой славы, Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова, аддзелы ідэалогіі райвыканкамаў вобласці.

У ліку тых, хто ўвайшоў у склад творчай групы пры падрыхтоўцы кнігі, — **кандыдат гістарычных навук, дацэнт, выкладчык Віцебскага кадэцкага вучылішча Мікалай ПІВАВАР.** Ён на працягу доўгіх гадоў разам з кадэтамі займаецца пошукам і ўвекавечваннем памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія дагэтуль спачываюць у няўлічаных пахаваннях Віцебскага раёна. Такіх, дарэчы, Мікалай Васільевіч знайшоў ужо пад 200, і калі паставіць на ўлік усіх не атрымліваецца, то захаваць іх каардынаты і фотаздымкі ўдалося ў кнізе «Звод помнікаў воінскай славы, памятных месцаў, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна». Многія напрацоўкі з гэтай кнігі ляглі ў аснову новага выдання.

«Такія Кнігі Памяці, накшталт той, што мы прэзентуем сёння, былі створаны і ў іншых еўрапейскіх краінах. Першая на тэрыторыі Беларусі была прысвечана Гомельшчыне. Падчас работы над выданнем мы вырашылі крыху змяніць канцэпцыю ў кнізе, прысвечанай Віцебскай вобласці: размясцілі гісторыю пошукавай дзейнасці ў паўночным рэгіёне, расказалі аб тых людзях, якія пачыналі і дагэтуль працягваюць вяртаць з небыцця імёны загінулых герояў», — расказаў Мікалай Півавар.

У кнізе прадстаўлены раёны Віцебшчыны ў храналагічным парадку іх вызвалення ў ходзе наступальных аперацый Чырвонай Арміі. На старонках выдання можна



знайсці спіс воінскіх пахаванняў кожнага раёна, якія стаяць на ўліку, а таксама фотаздымкі і поўны спіс помнікаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, што знаходзяцца на тэрыторыі вобласці. Знайсці кнігу ў папяровым варыянце пакуль складана, але яна прадстаўлена ў сетцы інтэрнэт у фармаце pdf.

«Вельмі радасна, што сёння на прэзентацыі прысутнічаюць кадэты, наша моладзь. Толькі з вашай дапамогай мы, сталыя пошукавікі, зможам працягнуць распачатае. І здорава, што Кніга Памяці будзе распаўсюджвацца і ў іншых краінах. Гэта адкрые новыя перспектывы для пошукавай дзейнасці», — заключыла **пошукавік Людміла НІКІЦІНА.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# ФЕІ-ЧАРАЎНІЦЫ НЕ БАЯЦЦА ЦЯЖКАЙ ПРАЦЫ

Кожную раніцу Галіна праз увесь горад едзе на веласіпедзе на работу. Пачуўшы яе голас, падапечная Марыя ўсміхаецца: паралізаваная жанчына цудоўна паразумелася з сядзелкай. А калі ў жонкі добры настрой, то шчаслівы і гаспадар, якому больш за 80. У гэтым двары звычайна два веласіпеды, на якіх прыязджаюць сядзелкі да інвалідаў І групы, — кожнай жанчыне неабходны асобны памочнік з індывідуальным падыходам...

— На жаль, у нас усё больш людзей патрабуюць дапамогі ў доглядзе, магчыма, таму, што сярэдні ўзрост насельніцтва павышаецца — гэта характэрна для шмат якіх краін свету. Узнікае неабходнасць у сістэмнай арганізацыі працы сацыяльных работнікаў. Далёка не заўсёды дзеці альбо сваякі здольныя забяспечыць належны догляд: бывае, што жывуць далёка, не могуць кінуць свае сем'і альбо занятыя на працы. Дапамога патрэбна і самім сваякам: яны часта растварваюцца ў жыцці хворага чалавека, становяцца сузалежнымі. Захаваць сябе як асобу дапамагае чалавек, для якога догляд іншых — работа, — тлумачыць **Алена БАРАШКА, дырэктар Бярозаўскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва,** аднаго з узорных у Беларусі згодна з рэйтынгам: тут распрацоўваюць і ўкараняюць розныя варыянты сацыяльнай падтрымкі (у раёне аказваюць больш за 300 відаў сацыяльных паслуг).

Чалавек на сваім месцы — шчасце не толькі яму, але і іншым. Алена Сяргееўна разумее, што значыць мець у сям'і інваліда, акрамя таго, яна 20 гадоў жыцця аддала працы ў сацслужбе. Кажа, што з вельмі шырокага спектру сацыяльных паслуг, якія аказваюцца ў раёне, найбольш запатрабаваныя — надомнае абслугоўванне і праца сядзелкі (цяпер гэта называецца «памочнік па доглядзе»), акрамя таго, бясплатнымі паслугамі нянькі карыстаюцца сем'і, якія выхоўваюць дзіця-інваліда альбо двойню.

Пад патранатам сацыяльных работнікаў у Бярозаўскім раёне на пачатак года знаходзяцца 871 чалавек: ветэраны, інваліды, адзінокія людзі. Каля 60 % з іх жывуць у сельскай мясцовасці. Сацыяльных работнікаў (якія наведваюць падапечнага два разы на тыдзень) 114 чалавек, але гэта без уліку сядзелак. Сярэдняспісачная колькасць супрацоўнікаў у раёне — 180 чалавек. Заробак у сацслужбе — каля 1000 рублёў, але ж колькі за гэтым працы... Сацработнік за дзень наведвае 4-5 чалавек, у аднаго падапечнага знаходзіцца каля дзвюх гадзін, аказвае ў асноўным сацыяльна-бытавую дапамогу. За тым, хто працуе на стаўку, замацавана восем чалавек у сельскай мясцовасці, а ў горадзе нагрузка размяркоўваецца на 11 чалавек. У сельскай мясцовасці сацыяльныя работнікі — у асноўным пенсіянеры, якія працягваюць працаваць, а некаторыя яшчэ і падпрацоўваюць сядзелкамі.

***— Сядзелка патрэбна тым, хто не ходзіць?***

— Неабавязкова. Напрыклад, інвалід па зроку можа сам перамяшчацца, а сядзелка забяспечвае асабістыя гігіенічныя працэдуры альбо тыя, без якіх чалавек не можа існаваць. Паслуга гэта платная, але па сацыяльна нізкіх цэнах (за 1,16 рубля ў дзень). Гэта мінімальны сацыяльны стандарт, які гарантуе дзяржава. Але можна аплаціць 2, 4, 6 ці 8 гадзін. У абавязкі сядзелкі ўваходзіць змена падгузкаў, кармленне, суправаджэнне на прагулку, замена споднях і пасцельнай бялізны, прыборка памяшкання. Нагрузку сядзелкі кантралюе інспектар, які рацыянальна падыходзіць да арганізацыі працы: каб кліенты жылі ў адным сектары з работнікам. Але не заўсёды так атрымліваецца. Дзякуючы загадчыцы аддзялення Вользе Чайчыц і згуртаванаму калектыву інспектараў, мы можам аказваць індывідуальную дапамогу непрацаздольным людзям у залежнасці ад патрэб, — удакладняе Алена Барашка. — Сацработнікам няпроста быць, а праца сядзелкі ўвогуле цяжкая. Ды і бабулі цяпер не тыя, што раней, людзі ва ўзросце бываюць капрызныя. Стала больш падапечных з дэменцыяй: магчыма, у век прагрэсу мозг не спраўляецца з патокам інфармацыі. Такі чалавек не разумее, што небяспечны і для сябе, і для іншых: напрыклад, можа пакінуць уключаным газ... Для пажылых людзей з дэменцыяй прадугледжана паслуга «дзённага нагляду».

Сацработнік — гэта заўсёды чужы чалавек, бо дзеці абавязаны клапаціцца пра сваіх пажылых бацькоў паводле закона. Нядаўна прыйшоў у раённую сацслужбу мужчына, ваенны пенсіянер. Жыве з мамай, якой больш за 80 гадоў. Пачытаў пра абавязкі сацработніка і кажа: «Я сам усё гэта раблю, можа, вы мне заплаціце?» І атрымаў адказ: «Не, вы гэта робіце як сын».



— Нашы сацработнікі — гэта феі-чараўніцы, якія часам замяняюць родных і блізкіх. У нас ёсць сямейныя пары сацработнікаў — муж і жонка, якія працуюць шмат гадоў. Сваіх падапечных бабуль яны запрашаюць на нейкія святы, разам ходзяць у храм. Такім чынам прасоўваюцца такія формы сацыяльнага абслугоўвання, як прыёмная сям'я, замяшчальная, гасцявая. Па-чалавечы адметная паслуга — «Храм для душы», а «Трывожная кнопка» спрацоўвае, калі дапамога патрэбна тэрмінова, — гаворыць Алена Барашка. — Калі сацработнікі па 15—20 гадоў звязаныя з нейкім чалавекам, то становяцца яму блізкімі людзьмі. Ёсць выпадкі, калі старога забіраюць на «сацложак», і яны наведваюць яго часцей, чым родныя.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

ПАЗНАЙ БЕЛАРУСЬ

# «У ПАМЯЦІ ЗАСТАЕЦЦА ТОЕ, ШТО ЎРАЗІЛА»

## Экскурсавод года — аб цікавых маршрутах і VR-акулярах

Брастаўчаніна Аляксандра СТРОКАЧА назвалі экскурсаводам года па выніках Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь — 2024», які праводзіцца Міністэрствам спорту і турызму. Найлепшы гід краіны працуе ў Брэсцкім абласным цэнтры турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі.

Упершыню ўзяць удзел у конкурсе «Пазнай Беларусь» Аляксандр вырашыў у 2022 годзе: кажа, спадабаліся намінацыі. «Экскурсавод года», «Матэрыял года», «Фотаздымак года» — тыя з





іх, якія я вызначыў для сябе», — тлумачыць ён. У 2023 годзе будучы найлепшы гід краіны стаў дыпламантам конкурсу. Перамогу прынёс наступны конкурс, хоць заявак на ўдзел у ім было амаль у два з паловай раза больш (1772 заяўкі ў 2024-м, а ў 2023-м — 835). Так што канкурэнцыя ва ўсіх намінацыях была сур'ёзнай. «Звязда» даведалася ў Аляксандра Строкача, якая катэгорыя турыстаў самая складаная і якія якасці вылучаюць добрага экскурсавода.

### «ВУЧЫЦЦА ТРЭБА ПАСТАЯННА»

— Што вылучае добрага экскурсавода?

— Пастаяннае імкненне вучыцца. Шукаць невядомыя факты аб, здавалася б, ужо вывучаных маршрутах і аб'ектах, адкрываць для сябе і распрацоўваць для турыстаў новыя маршруты і напрамкі. У Беларусі мноства найцікавейшых месцаў, але сярод іх ёсць «раскручаныя», упадабаныя турыстамі, а ёсць незаслужана недаацэненыя і пры гэтым не менш цікавыя. Ды і пра ўжо добра знаёмыя маршруты нярэдка можна адшукаць нямала адметных гістарычных фактаў. Немагчыма, склаўшы тэкст экскурсіі, напрыклад, у 2005 годзе, потым дваццаць гадоў расказваць турыстычным групам адно і тое ж. Але ў Беларусі, мне здаецца, такіх экскурсаводаў няма: мае калегі сапраўды любяць сваю справу.

Па адукацыі Аляксандр Строкач — гісторык, а значыць, чалавек скрупулёзны, які паважае факты і ўважліва ставіцца да дат. А па натуры — падарожнік і першаадкрывальнік.

— Экскурсіі дазваляюць быць гісторыкам і пры гэтым знаходзіцца ў руху, — тлумачыць ён. — Мне падабаецца знаёміць людзей з Беларуссю, з гісторыяй майго роднага рэгіёна, прычым не толькі гасцей з-за мяжы, але і нашых суграмадзян. Вельмі часта мы ведаем гісторыю сваёй краіны і нават сваёй малой радзімы толькі ў агульных рысах. Распавядаючы беларусам пра нашу гісторыю, прыемна бачыць у іх вачах здзіўленне, а часам — і гонар за краіну.

Дарэчы, лічыцца, што найлепшымі гідамі па тым ці іншым рэгіёне становяцца менавіта мясцовыя ўраджэнцы. З гэтым можна спрачацца, кажа суразмоўнік, але доля праўды тут ёсць.

### «АДКУЛЬ У ІХ БЫЛІ ГРОШЫ?»

Групы турыстаў Аляксандр Строкач водзіць з 2011 года. Напачатку было складана пераадолець псіхалагічны бар'ер, успамінае ён:

— Важна ўмець не губляцца і не крыўдзіцца, калі здаецца, што цябе не слухаюць. Бывае, групы прыязджаюць не заматываваныя аб нечым даведацца — ад прадпрыемства прапанавалі экскурсію, вось і паехалі. Так і кажуць: раскажыце хуценька, і мы пойдзем у кафэ або па магазінах. Вось тут і важна знайсці нейкі факт, які зацікавіць, паверне думкі людзей у іншае рэчышча.

Людзі запамінаюць у першую чаргу не гістарычныя даты або падзеі, адзначае суразмоўца. У памяці застаюцца пачуцці і эмоцыі — тое, што здзівіла, уразіла:

— Нават калі вам здаецца, што слухалі вас няўважліва, часта напрыканцы маршруту аказваецца, што ваша праца не прайшла дарма. Гэта становіцца відавочна па пытаннях і водгуках пасля экскурсіі.

Якія пытанні задаюць экскурсаводу? Бываюць групы з пытаннямі канкрэтнымі, па сутнасці: які даход прыносіў маёнтак? колькі відаў дрэў высаджана ў парку? што з мэблі, посуду, карцін сапраўды з палаца, а што — адносіцца да той эпохі? Бываюць пытанні зусім нечаканыя (накшталт старога жарту гідаў: «А нагадайце, з-за чаго адбылася дуэль Пушкіна з Лермантавым?»). Бываюць турысты-эрудыты, якія загадзя вышукваюць які-небудзь дробны, нязначны гістарычны факт і высвятляюць, ці ведае пра яго экскурсавод.

— Немагчыма ведаць усё і быць гатовым да ўсяго, — кажа Аляксандр. — Калі экскурсавод нечага не ведае, гэта толькі падстава для яго развіцця.

Ну а часцей за ўсё людзей цікавіць, «адкуль у іх былі грошы», усміхаецца Аляксандр. Ён кажа, гэта пытанне абавязкова прагучыць з вуснаў кагосьці з турыстаў на маршруце Косава — Ружаны з яго раскошнымі палацамі.

**Самымі складанымі экскурсантамі гід года — 2024 называе падлеткавыя групы: кажа, сучасных 14—16-гадовых няпроста «выцягнуць з гаджэтаў».**

Тут адразу відаць, ці карыстаецца аўтарытэтам у дзяцей педагог, які прывёз іх на экскурсію (а таксама экскурсавод, які яе праводзіць). Калі так, дзеці будуць слухаць экскурсію, не — прыйдзецца шукаць іншыя спосабы завалодаць іх увагай. У такім выпадку важна вызначыць лідара гэтай падлеткавай кампаніі, распавядае Аляксандр, і зацікавіць яго. Тады і астатнія стануць больш уважлівымі.

### «АЎДЫЯГІД НЕ ЗАМЕНІЦЬ ЭКСКУРСАВОДА»

Сёння расце запыт на ўнутраны турызм. Часта гэта турызм самастойны, калі сям'я проста адпраўляецца ў выхадныя наведаць тыя ці іншыя славутасці. І гэта вельмі добрая тэндэнцыя,



адзначае суразмоўца. Але многія гістарычныя аб'екты немагчыма ў поўнай меры раскрыць без экскурсавода, падкрэслівае ён. Так што не лянуйцеся заказваць экскурсіі і не шкадуйце на гэта сродкаў, тым больш гаворка ідзе аб невялікіх сумах.

— Аўдыягід, QR-коды, VR-акуляры — усё гэта выдатная дапамога для турыста. Але пакуль што ніякія інтэрактыўныя сродкі не заменяць экскурсавода, — кажа Аляксандр Строкач.

У Беларусі і ў Брэсцкай вобласці ў прыватнасці — вялікія турыстычныя перспектывы, перакананы найлепшы экскурсавод краіны — 2024. Акрамя мноства ўжо распрацаваных маршрутаў, ёсць яшчэ велізарнае поле для дзейнасці. Можна, напрыклад, стварыць маршрут па наваколлі Брэста, кажа ён, або распрацаваць маршруты па заказніках і прыродных аб'ектах. Апошнім часам папулярнымі становяцца экскурсіі па рэках і азёрах Беларусі.

Ну а наступны конкурс — «Пазнай Беларусь — 2025» — стартуе 1 лютага. Прыём заявак працягнецца да 30 верасня, а найлепшых з найлепшых у 13 намінацыях («Я пазнаю Беларусь», «Экскурсавод года», «Турыстычная кампанія года», «Аграэкасядзіба года», «Музей года» і г. д.) назавуць у снежні.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Смолевичи-Сузон» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

**квартиры** *(составные части и принадлежности: пристройка, навес, 2 сарая, уборная, погреб, сарай-пристройка)* **общей площадью 63,9 кв. м, инв. № 615/С-3450, расположенной в блокированном жилом доме на земельном участке с кадастровым номером 625883007101000099 (право общей долевой аренды, доля в праве: 2/3) площадью 0,1002 га по адресу: Минская область, Червенский район, Руднянский с/с, аг. Рудня, ул. Набережная, 2-2.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона рек и водоемов.*

Начальная цена – **1 269,55** бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – **126,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by

Аукцион состоится **04.03.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.03.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11; тел. для осмотра (8029) 780-14-13.**

УНП 691747895

**Брестский филиал**
**РУП "Институт недвижимости и оценки"**
**извещает о проведении открытого аукциона**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** легковой специальный седан ВАЗ 21074, год выпуска 2004 г., кузов № XTA21074052055424, регистрационный знак 0015 AE-1 | 1 271,01 | 127,10 |
| **Лот № 2:** легковой специальный седан ВАЗ 21070, год выпуска 2005 г., кузов № XTA21070052115049, регистрационный знак 0028 AI-1 | 1 599,83 | 159,98 |

**Местонахождение объектов:** г. Брест, ул. Северная, 13/1. **Продавец:** Государственное учреждение «Брестская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», 224001, г. Брест, ул. Северная, 13/1, тел./факс 80162542059. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 04 марта 2025 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 03 марта 2025 г. до 17.00**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Обувьторг»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 14.02.2025**

**Лот № 1:** административное здание, склады с инв. № 500/С-48997, площадь: 4 949,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 28. Начальная цена с НДС 20 % – 2 975 338,80 руб. Задаток – 297 533,88 ,00 руб.

Обременения: залог, договора аренды.
Капитальное строение с инв. № 500/С-48997 расположено на земельном участке 500000000009000119, площадь: 0,7544 га. Право аренды. Доля: 1/1. На земельных участках расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Обязанность по оформлению прав на земельный участок в случае необходимости его выделения под продаваемый объект возлагается на Покупателя. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 11.02.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**



У ЭПІЦЭНТРЫ

# ДРАКОН ПАТРАПАЎ АРЛА

## Чаму кітайскі стартап DeepSeek абрынуў амерыканскі фондавы рынак?

**Гэты тыдзень пачаўся знамянальна: у панядзелак кітайскі чат-бот DeepSeek знёс фондавы рынак ЗША, абрынуўшы капіталізацыю амерыканскіх кампаній на трыльён долараў.**

Агульны індэкс тэхналагічных гігантаў са Штатаў на Nasdaq-100 знізіўся амаль на 3 %. DeepSeek паставіў пад сумненне глабальнае тэхналагічнае лідарства Злучаных Штатаў, якое яны актыўна абвяшчаюць. Як вядома, на мінулым тыдні прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падпісаў указ аб ператварэнні краіны ў «сусветную сталіцу» штучнага інтэлекту (ШІ), а таксама абвясціў аб стварэнні кампаніі Stargate, якая інвесціруе $500 млрд у развіццё ШІ. Пры гэтым амерыканскі лідар сцвярджаў, што ЗША апярэджваюць Кітай у сферы распрацоўкі ШІ-тэхналогій.

З'яўленне DeepSeek абышлося амерыканскай кампаніі-вытворцы мікрачыпаў Nvidia амаль у $600 млрд рыначнага кошту. Астатнія тэхналагічныя гіганты, звязаныя з распрацоўкай штучнага інтэлекту, страцілі яшчэ многія дзясяткі мільярдаў долараў. У прыватнасці, кампанія Broadcom патаннела на 17,4 % ці каля $200 млрд. Кошт акцый Microsoft абрынуўся за дзень на 2,14 % (каля $70 млрд), а акцыі ўладальніка Google, кампаніі Alphabet, сышлі ўніз на 4 % ($95 млрд).

Найбагацейшыя людзі планеты страцілі сама меней $108 млрд. Капітал кіраўніка карпарацыі Oracle Лары Элісана скараціўся на $22,6 млрд, кіраўніка NVidia Джэнсена Хуанга — на $20,1 млрд, а старшыні савета дырэктараў Dell Майкла Дэла — на $13 млрд. Інвестары актыўна абмяркоўваюць, што скароціцца попыт на чыпы амерыканскіх кампаній.

Партал Defense One паведаміў, што поспех кітайскай кампаніі DeepSeek у распрацоўцы свайго чат-бота прымусіць ЗША перагледзець стратэгію развіцця штучнага інтэлекту і падыходы да нацыянальнай бяспекі. Спецыяліст па штучным інтэлекце і малых ШІ-мадэлях Рытвік Гупт адзначыў, што не будзе здзіўлены, калі Пентагон пачне актыўна падтрымліваць амерыканскія аналагі з адкрытым зыходным кодам. Паводле яго слоў, мінабароны «заўсёды мае магчымасць прымусіць распрацоўшчыкаў стварыць спецыялізаваныя версіі камерцыйных воблачных сэрвісаў, разгорнутыя непасрэдна на магутнасцях Пентагона». Эксперт адзначыў, што абароннае ведамства ЗША можа «папрасіць OpenAI і Claude» зрабіць ШІ-мадэль на тых жа прынцыпах, што і DeepSeek.

Кітайскі стартап быў заснаваны ў ліпені 2023 года ў Ханчжоў выпускніком Чжэцзянскага ўніверсітэта інжынерам-электроншчыкам Лянам Вэнфэнем. Кампанію фінансуе кітайскі хэдж-фонд High-Flyer, які сам Лян і заснаваў у 2015-м. У High-Flyer ён зарабіў капітал, выкарыстоўваючы штучны інтэлект для выяўлення заканамернасцяў, якія ўплываюць на кошты акцый, а пазней заявіў аб намеры распрацаваць ШІ ўзроўню чалавечага інтэлекту, запусціўшы ўжо сусветна вядомы DeepSeek. У каманду стартапа ўваходзяць маладыя выпускнікі вядучых кітайскіх універсітэтаў.

Заснавальнік Telegram Павел Дураў лічыць, што кітайскі прагрэс у эфектыўнасці алгарытмаў не ўзнік на пустым месцы, бо мясцовыя студэнты «ўжо даўно апярэджваюць іншых у матэматыцы і праграмаванні на міжнародных алімпіядах». Кіраўнік OpenAI Сэм Альтман назваў нашумелую ШІ-мадэль DeepSeek «уражлівай», улічваючы яе магчымасці за свой кошт. Марк Цукерберг адзначыў, што Meta аналізуе дасягненні кітайскага стартапа і спадзяецца ўкараніць некаторыя з іх у свае праекты.

Аналітыкі Morgan Stanley адзначаюць, што «падыход DeepSeek можа натхніць біггэхі на інавацыі». На іх думку, гэта добрая навіна для рынку, паколькі прагнозы акупляльнасці інвестыцый у штучны інтэлект могуць значна палепшыцца і галіна стане больш даступнай.

Тым часам стала вядома, што яшчэ адна кітайская кампанія — Alibaba Group Holding Ltd. — прадставіла абноўленую ШІ-мадэль, падкрэсліўшы, што яна пераўзыходзіць рашэнні Meta і DeepSeek па ключавых тэстах прадукцыйнасці. Згодна з афіцыйнай заявай, новая распрацоўка паказала сусветны ўзровень у шэрагу незалежных тэстаў.

ПАРАЛЕЛІ

# ТАКІ «ПАШПАРТ» ЛЕПШ... З'ЕСЦІ

## Як збеглыя зноў прадэманстравалі сваю сутнасць

**Чарговы «праект» збеглых ужо атрымаў афіцыйную ацэнку літоўскіх улад. Гаворка — пра самаробны «дакумент», што прасоўваецца на базе «пашпартнага цэнтра», які створаны ў Вільнюсе. Пагадзіцеся, уся гэтая «кантора» вельмі падобная на бэндэраўскія «Рогі і капыты», што бліскуча апісаны Ільфам і Пятровым.**

Чаго толькі вартае абяцанне, якое размешчана на спецыяльна створаным пад гэта сайце. Зацаніце: «Кожнаму, хто зробіць унёсак больш за тысячу еўра, мы гарантуем шчырую пісьмовую падзяку ад нашага калектыву. Па магчымасці мы таксама абяцаем выдаць пашпарт у ліку першых, калі вы адпавядаеце патрабаванням і маеце патрэбу ў дакуменце». Атрыманыя такім чынам грошы абяцаюць накіраваць на... аплату работы спецыялістаў. Як стала вядома, у «пашпартным стале» лічацца чатыры супрацоўнікі, кожнаму з іх пакладзена зарплата — па 3,5 тысячы еўра. Атрымліваецца, што за год набягаюць унушальныя 168 тысяч у еўрапейскай валюце. І гэта толькі самыя першасныя прыкідкі.

Як бачым, уладкавана ўсё было з размахам. Але «штосьці пайшло не так». Міністр замежных спраў Літвы Кестуціс Будрыс пасля закрытых слуханняў у сейме, на якім разбіралі правамоцнасць «пашпарта», заявіў, што «з прававога пункту гледжання ніякага дачынення да гэтага дакумента Літва не мае і прызнаць яго ніяк не можа». А старшыня парламенцкага камітэта па замежных справах Рэмігіюс Матузас назваў яго «сімвалічным дакументам, які прыдуманы беларускай апазіцыяй. Ён не будзе прызнаны сапраўдным на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі».

У сваю чаргу кіраўнік міністэрства ўнутраных спраў Літвы Уладзіслаў Кандратовіч паведаміў аднаму з мясцовых выданняў: «Такога пытання — прызнаваць ці не прызнаваць — нават не стаяла. У МУС разглядаюць адпаведнасць «пашпарта» як дакумента. Аднак на дадзены момант мы не бачым для гэтага падстаў: мы б не маглі прызнаць яго ні дакументам, на падставе якога выдаваліся б часовыя віды на жыхарства ў Літоўскай Рэспубліцы, ні праязным дакументам, ні пашпартам замежніка». На пытанне, навошта ж тады ўвогуле патрэбны гэты дакумент, сілавік задумлена адказаў: «Можа быць, яны хочуць ідэнтыфікаваць сябе як абшчыну». Пагадзіцеся, лепшага вызначэння і не прыдумаеш.

Раней шэраг палітыкаў у Літве выказалі абурэнне планамі збеглых стварыць уласныя альтэрнатыўныя «дакументы» з выявай коннага рыцара, падобнага да літоўскага «Віціса». На іх думку, стваральнікі фальшывак поўным ходам прысвойваюць сабе літоўскі сімвал.

Пракаментавалі і самі збеглыя: «Гэты «пашпарт» нічога не дае. Краіны яго не прызнаюць і ніколі не прызнаюць, эфектыўнасці і профіту ўвогуле проста нуль. Цяпер мы гэта ведаем дакладна».

Тым часам набліжаецца і прававая ацэнка дзеянняў маштабнага «лахатрону». Намеснік генеральнага пракурора Літвы Гінтас Іванаўскас у сваім лісце, які дасланы ў «пашпартны стол», нагадаў, што вытворчасць і выкарыстанне такіх «дакументаў» цалкам могуць трапляць пад артыкул 300 Крымінальнага кодэкса Літвы — «Выраб і выкарыстанне падробленых пасведчанняў асобы». Зразумела, з усімі вынікальнымі наступствамі.

Пры гэтым беларусы відавочна знаходзяцца ў зоне пільнай увагі спецслужбаў. Так, паводле паведамлення Дэпартамента міграцыі пры МУС Літвы, у мінулым годзе 598 грамадзян Беларусі былі прызнаны ў гэтай прыбалтыйскай краіне пагрозай нацыянальнай бяспецы. Па ўсім відаць, чарговы адрас літоўскія сілавікі ўжо намецілі. Так што надрукаваныя «пашпарты» лепш за ўсё з'есці.

**Матэрыялы падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

Камунальныя стасункі

# НА КОЛЬКІ ПАЦЯЖЭЛА «ЖЫРОЎКА»?

**Указам Прэзідэнта № 45, падпісаным 30 студзеня, устаноўлены гранічна дапушчальныя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі на 2025 год.**



«Падыходы да штогадовага фарміравання тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 снежня 2013 года № 550 «Аб тарыфным рэгуляванні ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі», — пракаментавалі ў прэс-службе Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. — Устанаўленне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва ажыццяўляецца пры захаванні асноўнага прынцыпу: плацеж насельніцтва па двухпакаёвай кватэры плошчай 48 м² з трыма жыхарамі пры нарматыўным спажыванні паслуг не павінен павялічвацца больш чым на 0,5 базавай велічыні (цяпер 21 рубель). У мэтах забеспячэння даступнасці аплаты насельніцтвам жыллёва-камунальных паслуг прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 студзеня 2025 года № 45 «Аб устанаўленні тарыфаў для насельніцтва ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі на 2025 год». Зменяненне гранічна дапушчальных тарыфаў прадугледжвае два этапы: з 1 студзеня змяняюцца тарыфы на ЖКП за выключэннем цэн на энергарэсурсы, якія выкарыстоўваюцца насельніцтвам на патрэбы ацяплення і гарачага водазабеспячэння; з 1 чэрвеня бягучага года — на вышэйназваныя энергарэсурсы».

Павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі — планавае. Як адзначыў раней **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй РАМАШКА**: «Жорсткая дзяржаўная палітыка ў сферы цэнаўтварэння і тарыфная палітыка пры фарміраванні кошту жыллёва-камунальных паслуг дазваляюць забяспечыць пастаянны невысокі ўзровень аплаты ЖКП у сукупным памеры даходаў сям'і».

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Сацыяльныя навіны

# ПРОМА-ПРАЕКТ «КАЛЕГІ ПА АМЕЗЕ» ПРОЙДЗЕ Ў БЕЛАРУСІ

**Рабочая сустрэча з удзелам кіраўніка МАРГ Артура Карповіча па пытанні рэалізацыі прома-праекта па прасоўванні рапсавага алею на ўнутраным рынку Рэспублікі Беларусь адбылася днямі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

Сярод удзельнікаў таксама — **старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Алег ЖЫДКОЎ, намеснік кіраўніка МАРГ Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА, начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Наталля МЕЛЬНІКАВА**, прадстаўнікі шэрагу дзяржорганаў, аблвыканкамаў і гарвыканкама, гандлёвых сетак, а таксама прадпрыемстваў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Профільны міністр пазначыў асноўныя мэты рэалізацыі гэтага прома-праекта: павелічэнне долі айчынных тавараў на паліцах крам; рэалізацыя якаснага тавару па справядлівых цэнах; павышэнне інфармаванасці аб карысных уласцівасцях рапсавага алею для спажыўцоў.

Трэба сказаць, што рапсавы алей — сапраўдная скарбніца карысных рэчываў. Ён насычаны амега-3, 6 і 9, тлустымі кіслотамі, што робіць яго ўнікальным прадуктам па прымальнай цане. Па сваіх карысных уласцівасцях ён не саступае аліўкаваму алею.

# СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ!

**Летась беларускія вытворцы актыўна ўдзельнічалі ў выставачнай дзейнасці за межамі краіны.**

Толькі ўнітарным прадпрыемствам «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты былі арганізаваны 29 выстаў і экспазіцый з удзелам беларускіх вытворцаў, прадпрыемстваў і арганізацый у 18 краінах свету ў 2024 годзе. Вынікі дзейнасці выставачнага апаратара былі разгледжаны на справаздачным сходзе пад кіраўніцтвам **старшыні БелГПП Міхаіла МЯТЛІКАВА**.

— Прадпрыемства «Белінтэрэкспа» сёння з'яўляецца адным з ключавых драйвераў у арганізацыі і правядзенні маштабных беларускіх экспазіцый і галіновых выставачных праектаў з удзелам айчынных вытворцаў на міжнародный арэне, — адзначыў Міхаіл Мятлікаў.

Дзякуючы прафесіяналізму і вопыту каманды выставачнага апаратара ў 2024 годзе эфектыўна і на высокім узроўні прадстаўлена нацыянальная экспазіцыя, афармленая ў стылістыцы Мірскага замка, у рамках міжнародных выстаў Caspian Agro і InterFood Azerbaijan у Баку Азербайджанскай Рэспублікі, якія наведалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў.

Прэзентаваная ў Шанхаі нацыянальная экспазіцыя Беларусі ў рамках VII Кітайскай міжнароднай выставы імпарту дазволіла інтэрактыўна пазнаёміць шматлікіх гасцей і наведвальнікаў з прыродным здабыткам і сацыякультурнай спадчынай краіны, якасна перадаць атмасферу Белавежскай пушчы праз унікальнае афармленне беларускай выставачнай лакацыі.

— Акрамя нацыянальных выставачных мерапрыемстваў у 2024 годзе прадпрыемства «Белінтэрэкспа» таксама арганізавала і правяло без бюджэтнай падтрымкі 27 беларускіх экспазіцый пад брэндамі Made in Belarus і Belarus. The Taste of Nature, — адзначыла **дырэктар «Белінтэрэкспа» Наталля КУРАШ**.

Выстаўкі адбыліся ў Азербайджане, Алжыры, Анголе, Грузіі, Егіпце, Зімбабвэ, Іране, Казахстане, Кітаі, КНДР, Манголіі, ААЭ, Саудаўскай Аравіі, Расіі, Танзаніі, Турцыі, Узбекістане і ПАР.

# «ВЯЛІКІ КАМЕНЬ» ПАШЫРАЕ КАМПЕТЭНЦЫІ

**Новыя рэзідэнты парка будуць вырабляць металаапрацоўчыя станкі і весці даследаванні ў сферы энергетыкі.**

У індустрыяльным парку «Вялікі камень» зарэгістраваны два новыя рэзідэнты — ТАА «СтанОк Сі-Эн-Сі» і ТАА «Навукова-даследчы цэнтр альтэрнатыўнай энергетыкі і тэхналогій» («НДЦАЭТ»), паведамілі ў адміністрацыі «Вялікага каменя».

Інвестыцыйны праект кампаніі «СтанОк Сі-Эн-Сі» звязаны з машынабудаваннем. Прадпрыемства будзе вырабляць абсталяванне з лічбавым праграмным кіраваннем для апрацоўчай прамысловасці.

Кампанія «НДЦАЭТ» будзе весці навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія распрацоўкі ў галіне энергетыкі. Яна будзе ствараць высокатэхналагічныя рашэнні для захоўвання энергіі, якія могуць прымяняцца ў сферы электратранспарту, весці даследаванні па вытворчасці графену, а таксама інтэлектуальная кіравання энергаспажываннем.




Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Остромечево», 225034, Брестская обл., Брестский район, аг. Остромечево, пл. Октябрьская, д. 2 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

**Здание** (здание неустановленного назначения), инв. № 100/С-90020, общ. пл. 350,5 кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Тереспольская, 24А.
**Сведения о земельном участке**: общ. пл 0,1086 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания здания неустановленного назначения на праве аренды по 30.11.2028

**Начальная цена лота № 1, с НДС 20 % — 101 520,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

**Трактор К-744Р4, категория — «В»,** заводской номер Д1325, рег. знак АК-1 5192, 2017 г. в., инв. № 00014006, по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Лыщицкий с/с, 54

**Начальная цена лота № 2, с НДС 20 % — 219 600,00 бел. руб.**

**Шаг** электронных торгов составляет 5 % от начальной цены по всем лотам.
**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.03.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются: по 03.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Частное предприятие «Кристмас Плюс», 212002, г. Могилев, ул. Островского, д. 56, оф. 55 |

**Предмет электронных торгов: оборудование (б/у).**
Местонахождение:
Могилевская область, г. Быхов, ул. Авиационная, 11А

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Автоматический двухголовый пильный отрезной станок для алюминиевого и ПВХ профиля LJB05-400X3500, производство КНР | 20 160,00 |
| 2 | Станок автоматический штапикорез YILMAZ CK410 для производства окон и дверей из ПВХ | 3 600,00 |
| 3 | KABAN CA 3020 трехфрезный углозачистной автоматический станок для производства окон из ПВХ | 3 000,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота № 1, **10 %** от цены продажи лотов № 2, 3 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **04.03.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.03.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

В связи с утерей считать **недействительным** устав общественного объединения **«Белорусское общество инженеров-механиков»** (УНП 100929594).

# НЯМА СІЛ...

## Адкуль бярэцца хранічная стомленасць і як яе перамагчы?



З кожным годам павялічваецца колькасць розных прылад і тэхналогій, якія робяць наша жыццё больш камфортным. Гэта і бытавая тэхніка, якая аблягчае наш быт, і сэрвісы, якія дапамагаюць рабіць многія справы дыстанцыйна. Аднак, як ні парадаксальна, хранічнай стомленасці ў нашым жыцці ўсё больш. Ужо ў раёне абеду многія з нас адчуваюць сябе разбітымі і не ў стане працаваць далей. На што мы трацім час? Якія заняткі выклікаюць стомленасць? Колькі часу мы праводзім перад тэлевізарам і ў сацсетках? Як яго скараціць і чым замяніць «танны» дафамін? Якая ўзаемасувязь паміж хранічнай стомленасцю і дысцыплінай? Пра гэта размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гуменам ГАРБАННІДЖАДАМ.

***— У чым прычыны хранічнай стомленасці?***

— Калі параўнаць сучаснага чалавека са старажытным, які жыў некалькі тысячагоддзяў таму, работа мозга ў цэлым не надта адрозніваецца. А вось фізічнай нагрузкі і стрэсавых сітуацый у старажытнага чалавека было больш. Ён прачынаўся з усходам сонца, хадзіў на паляванне, збіраў фрукты і ягады, у цемры вяртаўся дадому. Але мог і не вярнуцца, напрыклад, стаўшы чыёйсьці здабычай. Сучаснаму чалавеку, пасля таго як прачнецца, трэба прывесці сябе ў парадак, паснедаць, выбраць адзенне, вырашыць шэраг сямейных і бытавых пытанняў. На работу ён прыходзіць з загружаным галаўным мозгам, але і там прыходзіцца рабіць шэраг выбараў. Падлічана, што сучасны чалавек за дзень каля 35 тысяч разоў робіць выбар, пачынаючы ад прадуктаў у краме і заканчваючы прыняццем рашэнняў на рабоце. За кошт гэтага наш галаўны мозг атрымлівае перагамленне яшчэ да абеду. Функцыю распаўсюджання нервовага імпульсу выконвае гармон глутамат, і ён працуе на поўнай магутнасці, а мы адчуваем сябе стомленымі.

У некаторых краінах нават існуюць такія традыцыі, як сіеста, сон пасля абеду, што павялічвае працаздольнасць і крыху асвяжае галаўны мозг. Гэта зразумелі яшчэ ў перыяд прамысловай рэвалюцыі, калі на заводах было вырашана даваць рабочым 15–20-хвілінныя перапынкі, хоць для таго часу падобнае было раскошай.

***— Як жа ўсё паспяваць і не стамляцца?***

— Давайце паглядзім, з чаго складаецца наша жыццё. Сярэдняя яго працягласць — каля 79 гадоў. Паколькі кожныя суткі па восем гадзін мы спім, атрымліваецца 1/3 жыцця, ці прыблізна 26 гадоў, і калі іх адмінусаваць, застаецца 53 гады. Яшчэ 11 гадоў па восем гадзін нам трэба хадзіць у школу, гэта больш чым сем тысяч гадзін, яшчэ каля пяці тысяч гадзін мы выконваем дамашняе заданне. Такім чынам, тры гады ідзе на адукацыю, а калі атрымліваць вышэйшую адукацыю — яшчэ два гады. Плюс каля 40 гадзін у тыдзень мы працуем ад 30 да 50 гадоў, і гэта мінус 10 гадоў, ад нашага жыцця застаецца 38 гадоў.

Акрамя таго, каля 90 хвілін у дзень мы ездзім на машыне ці ў грамадскім транспарце, стаім у пробках, а гэта два гады нашага жыцця, застаецца 36. На гатаванне і прыёмы ежы сыходзіць па 70 хвілін у дзень — атрымліваецца чатыры гады, застаецца 32. На розныя бытавыя справы мы трацім па гадзіне штодня, за ўсё жыццё гэта тры гады, застаецца 29. На асабістую гігіену сыходзіць каля 10 месяцаў. Аднак усё гэта неабходныя рэчы. Пры гэтым 115 тысяч гадзін мы праводзім у тэлефоне і тэлевізары — гэта 13 гадоў, пасля чаго застаецца ўсяго 16 гадоў.

***— Відавочна, што з гэтага можна скараціць...***

— Засяродзім увагу на трох лічбах. Першая — сон, на які сыходзіць 1/3 жыцця. Што будзе, калі яго скараціць? Сон для нас жыццёва неабходны. У гэты час галаўны мозг працуе, выконваючы важныя функцыі: аналізуе ўсё, што адбылося за дзень, перадае важную інфармацыю з кароткатэрміновай памяці ў доўгатэрміновую, вырашае некаторыя задачы без нашага ўдзелу, калібруе ўнутраныя органы. Для паўнацэннага мыслення, правільных рашэнняў усім нам, у тым ліку дзецям, неабходны паўнацэнны сон. Без яго ў дзяцей няправільна развіваецца нервовая сістэма, пагаршаецца паспяховасць у школе, парушаецца працэс мыслення. Дарослыя таксама горш працуюць, складаней знайсці правільныя рашэнні.

Другая значная частка нашага жыцця — адукацыя. На гэта ідзе шмат часу, але без сучаснай адукацыі ні адна краіна не можа функцыянаваць. Ды і кожнаму сучаснаму чалавеку трэба шмат ведаць і валодаць разнастайнымі навыкамі.

Яшчэ адна гіганцкая лічба — той час, які мы трацім на тэлевізар, гульні, месенджары і сацсеткі. Гэты час можна выкарыстаць для сябе, развіваючы ўласныя навыкі і веды, для сваёй сям'і, сваёй краіны. Гэта адна з новых разнавіднасцяў залежнасці. Такім чынам мы не толькі марнуем наш час, але і псуём свае біярытмы. Мабільны тэлефон, калі мы сядзім у ім перад сном, парушае сон, не дае мозгу паўнацэнна працаваць. Дзеці, якія перад сном захапляюцца камп'ютарнымі гульнямі, чатамі, не высыпаюцца, на наступную раніцу не могуць успрымаць інфармацыю на ўроках. Такім чынам, мы аўтаматычна псуём два найважнейшыя складнікі: сон і адукацыю, парушаючы ўсё наша жыццё.

***— Як змагацца з гэтай залежнасцю?***

— Трэба разумець, каму яна патрэбна ў такім масавым маштабе. У цяперашні час у многіх краінах кіруюць розныя лобі. Яны выкарыстоўваюць рэсурсы дзяржавы для дасягнення сваіх мэт — карыслівых і не звязаных з дабрабытам краіны. Англасаксы ў свой час з дапамогай макавай залежнасці разбуралі Кітай, Індыю і іншыя краіны. Цяпер іншыя, сучасныя віды залежнасці. Паралізуючы работу людзей, можна паралізаваць цэлыя дзяржавы.




Любая залежнасць звязана з выпрацоўкай дафаміну — гармону задавальнення. Механізм яго атрымання ад гераіну ці ад камп'ютарнай гульні аднолькавы. Каб з гэтым змагацца, патрэбны два крокі. Першы — прызнаць, што мы залежныя. Паколькі, каб вырашыць праблему, трэба прызнаць, што яна існуе. І адпаведна гэты «танны» дафамін замяніць іншым, бо цалкам ад яго не так проста адмовіцца. Самы просты шлях, які прапаную вучоныя для замены, — спорт. У Беларусі хапае спартыўных установ. Але сучасны чалавек дасягнуў такога ўзроўню свядомасці, што едзе ў спартыўную залу на машыне, каб там бегаць на беговай дарожцы. Таму нават калі не хочацца ісці ў спартыўную залу, можна даваць сабе фізічную нагрузку дома. Нават з хваробамі сэрца ці суставаў ёсць дазіраваныя адмысловыя нагрузкі, яны неабходны ў любым узросце.

Другі крок, які разгрузіць наш галаўны мозг, — гэта дысцыпліна. Калі мы загадзя прадумваем, што адзенем заўтра, што прыгатуем на сняданак, калі лепш заправіць машыну, мы будзем хутчэй працаваць, менш стамляцца і мець вышэйшую прадукцыйнасць. Наша жыццё кароткае і з пункту гледжання біялогіі мы павінны ўсяго толькі перадаць свае гены. Але перад сучасным чалавекам патрабаванні нашмат большыя. Мы павінны максімальна прынесці карысць сабе і сваёй краіне, дзе будуць жыць нашы дзеці і ўнукі, каб наступныя пакаленні сказалі нам «дзякуй».

**Алена КРАВЕЦ.**


**ОЗЕРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**

сообщает о проведении 5 марта 2025 г. по адресу: агрогородок Озеро, улица Дзержинская, 27б в 10.00 открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

| ЛОТ, № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Сумма задатка бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Минская, участок № 76, кадастровый номер 625682508601000573, с незавершенным незаконсервированным капитальным строением | 0,1652 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги | 40 000,00 | 314,74 + публикация в газете | 4 000,00 |
| 2 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Полевая, участок № 13, кадастровый номер 625682504101000079 | 0,1178 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 22 000,00 | 2 100,60 + публикация в газете | 2 200,00 |
| 3 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Полевая, участок № 14, кадастровый номер 625682504101000080 | 0,1199 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 22 000,00 | 2 061,49 + публикация в газете | 2 200,00 |
| 4 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Светлая, участок № 11, кадастровый номер 625682504101000083 | 0,1234 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 22 000,00 | 2 268,30 + публикация в газете | 2 200,00 |
| 5 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 14А, кадастровый номер 625682501601000035 | 0,1665 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 25 000,00 | 2 663,08 + публикация в газете | 2 500,00 |
| 6 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 21, кадастровый номер 625682501601000034 | 0,1875 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 28 500,00 | 2 625,61 + публикация в газете | 2 850,00 |
| 7 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 22, кадастровый номер 625682501601000033 | 0,1875 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 28 500,00 | 2 525,78 + публикация в газете | 2 850,00 |
| 8 | Минская область, Узденский район, поселок Ореховка, улица Центральная, участок № 2А, кадастровый номер 625682509101000058 | 0,1536 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги | 30 000,00 | 2 784,08 + публикация в газете | 3 000,00 |
| 9 | Минская область, Узденский район, поселок Ореховка, улица Центральная, участок № 25А, кадастровый номер 625682509101000059 | 0,1645 га | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 30 000.00 | 2 975,44 + публикация в газете | 3 000,00 |

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY97AKBB36410625001436000000 в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, БИК AKBBBY2X, УНП 600110154, код назначения платежа – 40901 (перечисление гарантийного взноса). Получатель – Озерский сельский исполнительный комитет.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б. Последний день приема заявлений – 28 февраля 2025 г. до 17.00. Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны предоставить следующие документы:

1) заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

3) копию документа, содержащего его идентификационные сведения (ксерокопию паспорта);

4) представителям гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукционов и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно получить по телефонам: (801718) 65 382, 49 347; +375295659160

# РАТАВАЛЬНІКІ ЗАЎЖДЫ ПОБАЧ

## У гарадах Міншчыны яны нават персанажы яркіх муралаў

У 2024 годзе на сценах розных устаноў і жылых дамоў у Мінскай вобласці з'явіліся новыя тэматычныя графіці, якія не толькі ўпрыгожваюць гарадское асяроддзе, але і служаць важным напамінам аб неабходнасці захавання правілаў бяспекі. Карэспандэнт «Звязды» не толькі высветліў, дзе можна паглядзець на гэтыя творы мастацтва, але і даведаўся, якую прыгажосць чакаць жыхарам цэнтральнага рэгіёна ў Год добраўпарадкавання.




Фота МНС.

Адным з самых прыкметных графіці стала **выява ратавальніка на сценах Салігорскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях**. У цэнтры кампазіцыі — ратавальнік, які ўвасабляе гатоўнасць службы да дзеянняў у крытычных сітуацыях. Побач з ім прадстаўлены пажарны аўтамабіль мінулага стагоддзя, які нагадвае аб доўгай і значнай гісторыі пажарнага ведамства. З ім кантрастуе сучаснае аўто на шасі айчыннага МАЗа, што сімвалізуе прагрэс і развіццё службы.

**Не менш уражлівае графіці з'явілася ў аграгарадку Вялічкавічы Салігорскага раёна**. Размяшчэнне гэтага мурала было выбрана з улікам блізкасці да Вялічкавіцкай сярэдняй школы. Афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Алена Немагай падкрэслівае важнасць «пяці крокаў ратавання», якія павінны ведаць усе — ад дзяцей да дарослых. Яна ўпэўненая, што такі візуальны напамін будзе працаваць як «назапашвальны эфект», павышаючы дасведчанасць аб правілах паводзін у надзвычайных сітуацыях.



**У маладым мікрараёне па вуліцы Барысаўца ў Слуцку, які яшчэ будуецца, з'явілася манументальнае графіці ў стылі бяспекі жыццядзейнасці**. Ініцыятыву ратавальнікаў падтрымала ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Слуцкага раёна. Аўтарам праекта стаў 28-гадовы мастак з Бабруйска Леанід Ніфёдаў, які ўжо стварыў другое графіці ў стылі МНС. На фасадзе намаляваны героі нованага мультсерыяла «Спецатрад 112», што займальна расказвае дзецям аб рабоце ратавальнікаў і тых надзвычайных сітуацыях, з якімі ім даводзіцца сутыкацца. Для зацікаўленых прадугледжаны QR-код, што дазваляе азнаёміцца з усімі серыямі мультсерыяла.

**У Дзяржынскім раёне ў 2024 годзе з'явіліся адразу тры новыя творы мастацтва, прысвечаныя пытанням бяспекі і службы МНС**. На фасадзе Негарэльскай СШ № 1 былў створаны мурал, які акцэнтуе ўвагу на бяспецы дзяцей. На палатне намаляваны ратавальнік побач з дзецьмі, сімвалізуючы абарону і клопат аб падрастаючым пакаленні. Кампазіцыю дапаўняе надпіс: «За бяспеку дзяцей — разам!», які нагадвае бацькам пра важнасць сумесных намаганняў у забеспячэнні бяспечнага дзяцінства. Характэрна, што на мурале адлюстраваны рэальныя людзі: фатаграфіі былі выбраны ў выніку конкурсаў па кірунку МНС. Ратавальнік Руслан Мірон, а таксама школьнікі Даніііл Ларчанка і Анастасія Лукашэвіч сталі жывымі сімваламі гэтай важнай місіі.

**Работа па стварэнні тэматычных графіці не толькі працягнецца, але і яшчэ больш нарасціць тэмпы і ў Год добраўпарадкавання. Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, у 2025-м новыя муралы ад ратавальнікаў упрыгожаць сцены Барысаўскага, Лагойскага, Смалявіцкага і Маладзечанскага раёнаў**. Ратавальнікі ўпэўненыя, што такія ініцыятывы дапамогуць павысіць дасведчанасць грамадзян і захаваць жыцці.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

ЭКСПАНАТЫ З ГЛЫБІНІ

# ЦУД БЕЛАРУСКІХ НЕТРАЎ

## Незвычайная калекцыя крэменю сабрана ў Бераставіцкім раёне

Музей знаходзіцца ў сярэдняй школе аграгарадка Вялікія Эйсманты. Тут можна ўбачыць экспанаты, якія нагадваюць работы скульптараў, настолькі адшліфавана і выразна яны выглядаюць. А між тым рука чалавека не мела да гэтага ніякага дачынення — усё зрабіла прырода. Дапытлівыя месцічы сабралі падарункі беларускіх нетраў, каб наблізіцца да спрадвечных загадак зямлі.



**Дырэктар музея Леанід КАЛЕСНІК**, ён жа настаўнік гісторыі і геаграфіі школы, не адно дзесяцігоддзе займаецца пошукамі мінералу крэменю незвычайных формаў. Самым прыдатным для гэтага месцам, на яго погляд, з'яўляюцца кар'еры па здабычы крэйды, якія знаходзяцца ў Ваўкавыскім раёне.

— Шмат разоў хадзіў услед за экскаватарам, які выбірае пароду, і шукаў у адвалах што-небудзь цікавае. Гэта даволі складана. Але ўдавалася знайсці вельмі своеасаблівыя па форме экспанаты, — расказвае дырэктар музея і прапаноўвае разглядзець вобразы ў сваіх знаходках.

Тут кожнаму яго фантазія падказвае сваё. Некаторыя экспанаты крэменю падобны на выявы жывёл, прычым кожны наведвальнік бачыць свой вобраз. Напрыклад, у адным і тым жа камяні адны бачаць сабаку, іншыя карову, а хтосьці марскога коціка.



Паколькі крэмень ствараецца крэйдавымі пародамі, ён можа ўтрымліваць розныя акамянеласці. У адным, напрыклад, захаваліся рэшткі марскога вожыка. На некаторых ёсць крышталі кварцавай пароды, якія стварыліся сотнямі гадоў.

— Адзін з камянёў мы нават разбілі, каб паглядзець, што там, знутры. І бачым там незвычайны ўзор з рознымі пластамі. А на іншым маем такую пустэчу з кварцавымі крышталікамі, звычайна гэта камяні шарападобнай формы. А вось у падмаскоўным крэменю, з месца здабычы цэментнай сыравіны, сустракаюцца і буйныя крышталі агату, — дэманструе Леанід Раманавіч свае экспанаты. — У музеі ёсць нямала вялікіх мінералаў, але мы іх не разбіваем, трымаем інтрыгу.

Дарэчы, да беларускага крэменю ў савецкі час вялікі інтарэс праяўлялі літоўцы. У 80-я гады яны прыязджалі на гродзенскія крэйдавыя кар'еры, шукалі тут незвычайнай формы і везлі ў Літву, затым і далей. На думку суразмоўніка, крэмень варта лічыць сімвалам Беларусі сярод мінералаў, бо тут можна знайсці надзвычай прыгожыя формы, якія мала дзе ўбачыш.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64), по поручению **управления по сельскому хозяйству и продовольствию Копыльского райисполкома** (223927, г. Копыль, пл. Ленина, д. 6), проводит открытый аукцион по продаже

**легкового автомобиля седан LADA ВАЗ-21703-138-31, 2013 г. в., регистрационный знак 2599 KI-5, кузов (VIN) XTA217030E0459082, инвентарный номер 01510007 цвет темно-синий), находящегося по адресу: Минская область, г. Копыль, пл. Ленина, 6.**

**Начальная цена** (без НДС) – **4 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **480,00** бел. руб.).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **05.03.2025** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.03.2025** до **17.00. Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**

**Тел. для осмотра транспорта +375 29 7552590, время осмотра: с 9.00 до 16.00, понедельник – пятница.** УНН 600023042



ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64), по поручению **государственного учреждения «Центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций Копыльского района»** (223927, Минская область, г. Копыль, ул. Максима Горького, 31/3), проводит открытый аукцион по продаже

**автомобиля легкового универсала LADA PRIORA ВАЗ-21713, 2011 г. в., регистрационный знак 6705 OK-5, кузов (VIN) XTA217130C0074426, цвет темно-серо-зеленый, инвентарный номер 01510002, находящегося по адресу: Минская область, Копыльский район, аг. Слобода-Кучинка, ул. Советская, 38а.**

**Начальная цена** (без НДС) – **5 200,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **520,00** бел. руб.).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **05.03.2025** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.03.2025** до **17.00.**

**Тел. для осмотра транспорта +375 29 566 37 46, время осмотра: с 9.00 до 16.00, понедельник – пятница.** УНП 600093323



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белмедстекло»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 04.03.2025**

**Лот № 1:** MAZ 5440A8. Кузов (рама) № Y3M5440A880001668. Начальная цена с НДС 20 % – 11 000,00 руб. Задаток – 1 100,00 руб.

**Лот № 2:** MAZ 5551 A2. Кузов (рама) № Y3M5551A290001757. Начальная цена с НДС 20 % – 6 960,00 руб. Задаток – 696,00 руб.

**Лот № 3:** PEUGEOT BOXER. Кузов (рама) № VF3YBBMRB11233888. Начальная цена с НДС 20 % – 12 840,00 руб. Задаток – 1 284,00 руб.

**Местонахождение лотов 1–3:** Минская обл., г. Борисов, ул. Толстикова, 2Б.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 27.02.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

## Официальные правила проведения рекламной игры

# «ТВОЙ СЧАСТЛИВЫЙ ПЛЮС»

